КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 29 (205) ◂ 20 жніўня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**КРАІНА, ЯКАЯ ЗНІКАЕ**

Стар. 6

**ЦІ ЁСЦЬ ШАНЕЦ У ЛІБЕРАЛАЎ?**

Пастаноўка мэтаў, што не падмацаваныя сродкамі для іх рэалізацыі, — галоўная загана ідэалагічнага мыслення.

Стар. 4

**ЗА ПОЛЬШЧУ РЭГІЁНАЎ**

Летам 1920 года адбылася падзея, якая, магчыма, мае для краіны не меншае значэнне, чым Цуд над Віслай.

Стар. 13

**КРАЯВІД З ЧУЖЫМІ ХВОЯМІ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ПОЛАЦКІ СТОЎНХЕНДЖ**

Нарыс Вольгі Хвоін

▸ **ВЫБАРЫ**

# ПАЛІТЫЧНЫ СОН ПАД ВЫСОКІМ ГРАДУСАМ

Вольга ХВОІН

**Кажуць, што прагрэс на Усход прыйшоў пасля таго, як вынайшлі кандыцыянеры. Відаць, спёка ўсё ж і праўда не спрые працы шэрага рэчыва. Топ-навіной летніх месяцаў сталася спёка, але ніяк не актыўныя дзеянні напярэдадні падзей, што мусяць вызначыць лёс Беларусі як мінімум на бліжэйшыя гады.**




Да прэзідэнцкіх выбараў застаецца ўсё менш часу, але з чым Беларусь увайшла ў летні перыяд, з тым і выходзіць з яго. Няма ні дамоўленасці наконт адзінага кандыдата ад апазіцыі, ні скаардынаванай праграмы дзеянняў. Няма і выразных партрэтаў патэнцыйных кандыдатаў на месца ў Чырвоным доме па вуліцы Карла Маркса. З усіх заяўленых прэтэндэнтаў у кандыдаты бадай што найбольш актыўна паводзіць сябе лідэр кампаніі «Гавары праўду!» паэт Уладзімір Някляеў — сустрэчы з людзьмі ладзіць, заявы ў міністэрствы рыхтуе. Ад таго і ў беларускай незалежнай прэсе часцей узгадваецца. На іх тле Някляеў выглядае энергічным і неабыякавым. Паездкі па рэгіёнах — паспяховая стратэгія мінулай перадвыбарчай кампаніі Аляксандра Мілінкевіча — таксама пакуль выкарыстоўваюцца толькі паэтам, які рынуўся ў палітыку.

Яшчэ адзін прэтэндэнт з амбіцыямі, які ад пачатку пазіцыянаваўся як моцны палітык — Андрэй Саннікаў, — цягам лета зарэкамендаваў сябе хіба што як арганізатар чарговай акцыі салідарнасці 16 жніўня. Што праўда, прыйшло не дзесятак чалавек, як тое часцяком бывае, а паўтары сотні.

Астатнія «маладыя і перспектыўныя», відаць, ці вялі падпольную працу, ці папросту адпачывалі пад шчодрым сёлетнім сонцам. На гэтым тыдні кіраўнік Еўрапейскай кааліцыі Мікола Статкевіч паспрабаваў зладзіць «круглы стол» па вылучэнні «адзінага», але кандыдаты дружна праігнаравалі гэта мерапрыемства. У выніку ў намеснікаў прэтэндэнтаў на ролі ў будучай палітычнай дзеі атрымалася прыняць Заяву аб каардынацыі сумесных дзеянняў падчас выбарчай кампаніі. Пагадненне прадугледжвае каардынацыю вылучэння людзей у выбарчыя камісіі ды агульны заклік выходзіць на Плошчу пасля выбараў. Як гэта будзе на практыцы, пакажа час.

Вызначыцца з персонай адзінага кандыдата ад апазіцыі паспрабавала Рада беларускай інтэлігенцыі. Але спіс палітыкаў, падрыхтаваны ёй, чамусьці аказаўся скарочаным. У выніку кампетэнцыя гэтай ініцыятывы патрапіла пад сумневы і ад паслуг Рады інтэлігенцыі палітыкі вырашылі адмовіцца.

Тым часам дзеючы кіраўнік Беларусі няспешна рыхтуе глебу да сваёй выбарчай кампаніі: у жніўні крыху падвысілі пенсіі, цяпер чакаецца падвышэнне стыпендый, і наконт заробку ў 500 даляраў Лукашэнка быццам бы не перадумаў. А інтэрнэт-рэсур «Белпартызан» распаўсюдзіў чутку, што ў сістэме МУС у адпачынкі восенню адпускаць не будуць. Быццам бы выбары могуць прайсці напрыканцы лістапада, і ўжо з кастрычніка асабісты склад міліцыі будзе пераведзены на рэжым узмоцненага нясення службы.

Рашэнне для паліцэйскай дзяржавы лагічнае, тым больш, што цяпер Адміністрацыя Лукашэнкі займела апанентаў не толькі ў стане некансалідаванай унутранай апазіцыі, але і па-за ўсходнімі межамі — у Маскве. Інфармацыйныя войны паміж Расіяй і Беларуссю не паслабляюцца, да таго ж памочнік прэзідэнта Расіі Сяргей Прыходзька нават паабяцаў агучыць кампрамат на Лукашэнку ды даказаць непаслядоўнасць беларускага лідэра. Хаця што тут даказваць, калі ўдумліваму чалавеку і без Прыходзькі зразумелая тактыка знешняй палітыкі Аляксандра Рыгоравіча — вужом на патэльні звівацца ды спонсараў шукаць.

Трэба прызнаць, што «развод» паміж Мінскам і Масквой многія ўспрымаюць пазітыўна, маўляў, нарэшце Лукашэнка страціць моцную падтрымку Расіі. Але наіўна спадзявацца, што ў Крамлі плануюць падтрымаць палітыка, які будзе адстойваць суверэнітэт Беларусі ды імкнуцца да рэформаў. Расія паступова страчвае ўплыў на тэрыторыях, якія належалі ёй на працягу дзесяцігоддзяў, і наўрад ці яе кіраўніцтву імпануе ідэя займець незгаворлівых ды ідэйна чужых калегаў у Адміністрацыі на Карла Маркса.

Кіраўнік Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Віталь Сіліцкі прапануе разгледзець варыянт развіцця падзей, калі Масква адасобіцца непасрэдна ад прэзідэнцкай кампаніі, а затым ужо заявіць, што выбары ў Беларусі не адпавядалі дэмакратычным стандартам. Пасля гэтага пазбаўленае легітымнасці кіраўніцтва Беларусі, каб захаваць уладу, будзе вымушана праявіць гнуткасць цыркавога акрабата, каб прагнуцца пад маскоўскае кіраўніцтва. Сілавых сцэнараў пакуль ніхто не прадказвае. Усё ж Беларусь — не азіяцкая краіна, ментальнасць у людзей іншая, і бішкекскія падзеі паўтарыць пад бокам ЕС не выпадае.

Сацыёлаг Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў Аляксандр Сасноў зазначыў, што, паводле апошняга даследавання, 62% апытаных падтрымалі тэзу пра тое, што Беларусі патрэбныя перамены. Эксперт лічыць, што гэта ўскосны паказчык пратэстных настрояў.

«Цяжка гаварыць пра гатоўнасць да радыкальных дзеянняў нацыі агулам. Але асобныя групы могуць праявіць сваю незадаволенасць сітуацыяй», — заўважае Сасноў. Беларусы не хочуць падвышэння коштаў тавараў, росту камунальных тарыфаў, спаду вытворчасці, але ўдзельнічаць у мітынгах і страйках гатовыя не больш за 10 працэнтаў рэспандэнтаў.

У каментарах да чэрвеньскага апытання НІСЭПД эксперты адзначаюць паніжэнне ўзроўняў страхаў амаль да дакрызіснага ўзроўню. Тлумачаць гэта тым, што сацыяльныя выплаты, узмоцненыя прапагандай, паўплывалі на свядомасць людзей. Калі да моманту галасавання ўлада зможа ўтрымаць набраны тэмп, то ў ЦВК не паўстане адмысловых праблем з падлікам галасоў. Сацыяльныя індэксы ўпершыню за апошнія гады не зафіксавалі адназначнай тэндэнцыі ў дынаміцы грамадскіх настрояў. Займацца прагнозамі становіцца ўсё складаней.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ШКЛОЎ. УШАНАВАЛІ СІМВАЛ ГОРАДА

Нідзе ў Магілёўскай вобласці не пабачыш столькі парнікоў, як у Шклове і раёне. Тутэйшыя жыхары — прафесіяналы ў вырошчванні агуркоў. Гародніна дае ім прыбытак, і яны яе шануюць. І таму ў мінулую нядзелю тут адбылося традыцыйнае свята «Дзень агурка». Распачалося яно тэатралізаваным прадстаўленнем ля скульптурнай кампазіцыі «Агурок». Затым святкаванне прадоўжылася на Цэнтральным рынку. Тут жыхароў і гасцей горада чакалі агурковыя падворкі, дэгустацыя страў і шмат што іншае.

### КУЗЕВІЧЫ. ПРАПАГАНДАВАЛІ АГРАЭКАТУРЫЗМ

У вёсцы Кузевічы на базе фермерскай гаспадаркі «Панскія сажалкі» прайшоў другі фестываль аграэкатурызму «Кузевічы–2010». Мэта фестывалю — папулярызацыя такога кшталту адпачынку ў межах адраджэння вёскі. Удзельнікі фестывалю прадэманстравалі шырокае кола паслуг, якія яны могуць прадставіць адпачываючым.

### МОТАЛЬ. ФЭСТ СМАЧНЫХ СТРАЎ

У трэці раз адбудзецца Міжнародны кулінарны фестываль «Мотальскія прысмакі», які праходзіць у вёсцы Моталь. У прагpаме фестывалю: выстава ў старога млына, дэманстрацыя старадаўніх абрадаў і культурных і кулінарных традыцый Брэстчыны.

У мерапрыемстве прымуць удзел эксперты са шведскай арганізацыі «Рэгіянальная кулінарная спадчына Еўропы», галандскія кулінары і кухары, прадстаўнікі рэстараннага бізнесу Беларусі і замежжа.

Мяркуецца, што на фестывалі будзе прысутнічаць шмат гасцей і замежных дэлегацый (прадстаўнікі яўрэйскай абшчыны, мастацкія калектывы з Польшчы, Украіны, журналісты Ізраіля, амбасадар ЗША). Госці пазнаёмяцца з унікальнымі кулінарнымі традыцыямі і асаблівасцямі самабытнага кутка Палесся, паспрабуюць знакамітыя мотальскія каўбасы і пірагі ды іншыя стравы прыгатаваныя мясцовымі гаспадынямі.

### МАСТЫ. УШАНАВАЛІ ПАМЯЦЬ ГЕРОЯЎ

У вёсцы Масты Левыя да дзевяностагоддзя бітвы, падчас якой добраахвотнікі з першай Беларуска-Літоўскай дывізіі, што дзейнічала ў складзе Войска Польскага, перамаглі армію камандарма Лазарэвіча, адбылося адкрыццё адноўленага помніка загінулым салдатам. Да справы спрычыніліся мясцовыя энтузіясты. Яны адшукалі выяву помніка, згодна якой былі выраблены знішчаныя фрагменты манумента, акультурылі тэрыторыю.

У дзень адкрыцця ў мясцовым касцёле адбылася імша. На мерапрыемстве прысутнічаў польскі консул, прадстаўнікі мясцовай улады.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

САЛІДАРНАСЦЬ

## НЕ АБЫШЛОСЯ БЕЗ ЗАТРЫМАННЯЎ

**Генадзь КЕСНЕР**

**Шэсць чалавек былі затрыманы 16 жніўня, у Дзень беларускай салідарнасці — да і пасля мірнае акцыі «Ланцуг неабыякавых людзей», якая прайшла ўвечары ў панядзелак каля будынку прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**



Фота аўтара

Уздоўж праспекта Незалежнасці моўчкі сталі каля 150 чалавек з партрэтамі зніклых без вестак экс-віцэ-спікера Вярхоўнага Савета 13-га склікання і незаконна адстаўленага старшыні Цэнтрвыбаркаму Віктара Ганчара, былога міністра ўнутраных спраў генерала Юрыя Захаранкі, бізнесмена і грамадскага дзеяча Анатоля Красоўскага і аператара расійскага тэлеканалу РТР, сябра ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Дзмітрыя Завадскага.

Яшчэ за некалькі гадзін да акцыі ў падваротнях і бліжэйшых да НАН РБ дварах можна было заўважыць аўтобусы з таніраванымі шыбамі, каля кінатэатра «Кастрычнік», у пераходзе ля станцыі метро «Акадэмія навук» і на пляцоўцы перад будынкам галоўнай інтэлектуальнай установы краіны шпацыравалі бутузы ў цывільным з рацыямі і супрацоўнікі праваахоўных органаў у форме. Побач з «Кастрычнікам» былі прыпаркаваны рэанімабіль і мікрааўтобус «хуткай дапамогі». Чакалі немаведама чаго.

Тых, хто з метрапалітэнаўскага пераходу кіраваўся на абвешчанае арганізатарамі месца збору, літаральна пералічвалі кароткафрызураваныя юнакі з рацыямі і не хаваючыся дакладалі інфармацыю «вышэй».

У 18.00 уздоўж галоўнага праспекта сталіцы сталі дзесяткі людзей, якія трымалі партрэты зніклых. Сярод тых, хто такім чынам вырашыў нагадаць беларускай і міжнароднай супольнасці пра праблему гвалтоўных выкраданняў, былі як простыя людзі, такі і вядомыя асобы — старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, кіраўнік мінскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ Віктар Івашкевіч, лідэры грамадзянскіх кампаній «Еўрапейская Беларусь» Андрэй Саннікаў і «Гавары праўду!» паэт Уладзімір Някляеў, старшыня юрыдычнай камісіі РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» Гары Паганяйла, іншыя праваабаронцы, палітыкі і грамадскія дзеячы.

Увесь час, пакуль людзі стаялі з партрэтамі, супрацоўнікі праваахоўных органаў праз мегафоны папярэджвалі, што акцыя не дазволеная Мінгарвыканкамам, і калі грамадзяне не разыдуцца, то будуць прыцягнуты да адказнасці. У выніку, ужо пасля завяршэння мерапрыемства, міліцыянты з выкарыстаннем сілы затрымалі актывістаў «Еўрапейскае Беларусі» Яўгена Афнагеля і Паўла Юхневіча, у пастарунку апынуліся яшчэ трое маладзёнаў, пазней стала вядома, што яшчэ да пачатку акцыі быў «нейтралізаваны» моладзевы актывіст Антон Койпіш. Потым усіх адпусцілі нават без складання пратаколаў аб затрыманні. Навошта было гарод гарадзіць, тым больш што за падзеямі з супрацьлеглага боку праспекта назіралі замежныя дыпламаты?

ПЕРАСЛЕД

## ЛІТАРАТАРУ ПАГРАЖАЕ ТУРМА

**Вольга ХВОІН**

**Літаратара Міхаіла Башуру абвінавачваюць у падробцы дакументаў. За гэта яму пагражае турэмнае зняволенне. Сябры літаратара мяркуюць, што інцыдэнт абумоўлены тым, што Башура з'яўляецца актывітам кампаніі «Гавары праўду!».**

Міхаілу Башуру прад'яўленае абвінавачванне па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса — падробка, выраб, выкарыстанне альбо збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў у мэтах выкарыстання самім выканаўцам і тыя ж дзеянні, але здзейсненыя групай асобаў па папярэдняй змове. Адказнасць за гэта парушэнне — пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў.

Башуру затрымалі 6 жніўня ў кватэры, якую ён здымаў. Спачатку невядомы чалавек у цывільным паспрабаваў выклікаць Міхаіла з кватэры, але той адмовіўся выходзіць. Вечарам, калі літаратар усё ж выходзіў з кватэры, яго забралі людзі ў цывільным і паведамілі, што затрымліваюць па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства некалькі гадоў таму: Башура быццам бы прадставіў для атрымання крэдыту даведку з несапраўднай інфармацыяй аб заробках. Ад 6 жніўня ён знаходзіцца пад вартай. Адвакат Башуры спадарыня Сідарэнка не выключае, што ў бліжэйшы час Міхаіла могуць перавесці ў следчы ізалятар Жодзіна.

Прадстаўнікі кампаніі «Гавары праўду!» мяркуюць, што затрыманне Башуры — звяно ў ланцугу палітычна матываванага пераследу прадстаўнікоў кампаніі. Нагадаем, што ў маі вобшукі на офісах «Гавары праўду!» прайшлі па ўсёй Беларусі, а яе кіраўнік Уладзімір Някляеў пасядзеў у СІЗА.

Міхаіл Башура мае дачыненне да выдавецтва «Галіяфы», таму ў знак падтрымкі калегі было вырашана перавыдаць зборнік яго вершаў «Паляванне на мух», але пад новай назвай. Дырэктар выдавецтва і сябра Міхаіла Башуры Зміцер Вішнёў сказаў, што кнігу «пастараюцца выдаць да верасня», але дзе і ў якой форме адбудзецца яе прэзентацыя, яшчэ не вядома. «Самі разумееце, сітуацыя спецыфічная», — кажа Вішнёў. Да слова, на прэзентацыі кнігі выдаўцы плануюць яе гасцям уручыць «бонусную» прадукцыю — майкі з адмыслова замоўленым прынтам.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

## 19 ГАДОЎ УКРАІНСКАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**Аляксей ХАДЫКА**

**18 жніўня ў Нацыянальным прэс-цэнтры новы Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Украіны ў РБ Раман Пятровіч Бязсмертны упершыню сустрэўся з беларускімі журналістамі. Нагодай зрабілася галоўнае свята Украіны — Дзень незалежнасці, які наша суседка адзначае 24 жніўня ў 19-ы раз.**

Бліскучы ў сваім прамоўніцкім мастацтве і асабліва кампетэнтны ў эканамічных пытаннях, новы амбасадар сустрэўся з поўнай залай прадстаўнікоў СМІ ў добрым гуморы. Гэтаму спрыяла не толькі надвор'е, якое злітавалася і сцішыла спякоту, але і надвор'е ва ўкраінскай эканоміцы і гандлёвых сувязях паміж краінамі-суседкамі.

Лічбы першага паўгоддзя 2010 года ў параўнанні з годам мінулым сведчаць пра рост украінскага ВУП на 6,3%, прамысловай вытворчасці на 12%. За гэты ж час беларуска-ўкраінскі гандлёвы зварот павялічыўся на 46,7%, дасягнуўшы 2,3 мільярда долараў ЗША. Адпаведна, экспарт з Украіны вырас на 37,8% (923 мільёна долараў), яшчэ вышэй узняўся імпарт з Беларусі. 53,3% (1,3 мільярда долараў). Украіна сапраўды мае патрэбу ў некаторых групах беларускіх тавараў — найперш мінеральных угнаеннях, тэхніцы і харчаванні, зазначыў пасол.

Увогуле, украінскі ўрад схільны як найменш умешвацца ў справы гандлю, лічачы першаснымі ў гэтай сферы механізмы эканамічнага і бізнесовага, а не заканадаўчага рэгулявання. Таму ніякіх пошлінаў на светлыя прадукты нафтаперапрацоўкі ва Украіне не ўвядуць. Як і працягнуць транзітам пастаўляць венесуэльскую нафту праз тэрмінал у Адэсе па чыгунцы ў Мазыр. Зараз гэта выгодна ўсім бакам.

Ні ў якім выпадку не адбудзецца далучэнне Украіны да Мытнага саюза — нявыгадна. Гэты саюз — рынак толькі трох краін. А Украіна — сябар СГА (Сусветнай гандлёвай арганізацыі), што аб'ядноўвае гандлёвую прастору 160 дзяржаў. Пад рамкі СГА зараз і падстройваецца эканоміка Украіны. «Хаця ніколі не кажы ніколі», — афарыстычна дадаў амбасадар.

Вобразна гучаў і адказ Рамана Бязсмертнага на пытанне карэспандэнта «НЧ» наконт магчымай «перазагрузкі» беларуска-ўкраінскіх адносінаў пасля прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне. Прэзідэнты прыходзяць і сыходзяць, а народы застаюцца, заўважыў пасол, звярнуўшы ўвагу на тры фактары нашых стабільна добрых стасункаў. Па-першае, вялізны двухбаковы эканамічны інтарэс, затым, гістарычныя стогадовыя, нават тысячагадовыя, гуманітарныя і культурныя традыцыі. Нарэшце, тысячакіламетровая мяжа, якая не разлучае, але аб'ядноўвае вялікія 48-мільённы і 10-мільённы народы.

Дарэчы, у дэлімітацыі мяжы паміж краінамі, якаяаднавілася апошнім часам, існуюць пэўныя праблемы. Беларускі бок звязвае з яе завяршэннем выплат Украінай даўгоў, пазасталых яшчэ з савецкага часу. Украінскі падыход: гэта пазыкі часоў ужо няіснага СССР і ўжо зніклых прадпрыемстваў. Складаная тэма закранался падчас першага візіту ў Беларусь прэзідэнта Віктара Януковіча і ў падпісаных у выніку дакументах — Сумесныя заяве і Плане сумесных дзеянняў «Дарожная карта». Як заўважыў пасол, нашым новым дзяржавам спаўняецца па 19 гадоў, яны па чалавечым узросце толькі пайшлі ў ВНУ і вучацца вырашаць складаныя пытанні ў адбудаваных нацыянальных дамах і жыць па-добрасуседску.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ДЗЯКУЙ ЗА РЭКЛАМУ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Галоўнай тэмай для абмеркавання на мінулым тыдні стала, канешне, анамальная спякота. Кожны дзень надвор'е біла тэмпературныя рэкорды, навіны пачыналіся толькі з гэтага. У Расіі тушылі пажары, а ў нас спякота перасякалася з навальніцамі. Нават жартавалі — Беларусь не прапускае дажджы ў Расію, пакуль тая не заплаціць за транзіт. І зусім не было б пра што пісаць, каб не агітпрпоп.**




Інтэрнэт забіты абмеркаваннем чарговай «нятленкі» НТВ пад назвай «Хросны бацька–3». Новая серыя фільма апавядае пра бізнес сям'і Аляксандра Лукашэнкі: бізнес-сувязі Віктара і Дзмітрыя Лукашэнкаў. Гаворка ідзе і пра алігархаў Чыжа і Пефціева, і пра пасаду Лукашэнкавай нявесткі Ліліі. Інтэрв'ю даюць былы начальнік Упраўлення МУС па барацьбе з карупцыяй Вячаслаў Дудкін, які вымушаны быў уцячы з краіны пасля таго, як былі спыненыя расследаванні карупцыйных злачынстваў з удзелам найвышэйшых чыноўнікаў. Выступаюць таксама дэпартаваны з Беларусі расійскі прадпрымальнік Алан Плієў, намеснік дырэктара Інстытута краінаў СНД, прапуцінскі палітолаг Уладзімір Жарыхін, былы следчы пракуратуры, а цяпер праваабаронца Алег Воўчак.

Дэпартаваны з Беларусі журналіст Міхал Падаляк расказвае пра жанчын Лукашэнкі. А дэпартаваны палітолаг Андрэй Суздальцаў называе выбух 3 ліпеня 2008 года вынікам барацьбы Віктара Шэймана і Віктара Лукашэнкі.

Здаецца, на НТВ таксама «пераграэліся». У такую спякоту не ўзнікае нічога больш цікавага, як паставіць «Хроснага бацьку» «на паток». Не ведаю, чыя гэта замова, але НТВшнікі ўжо яўна перабольшылі. Пры «патокавай» сістэме «Хросны бацька» ўжо ўспрымаецца не як дакументальны, а як мастацкі фільм, якому не верыць, але глядзяць з-за «закручанасці» сюжэту і выдатнай гульні прафесійных акцёраў. Асабліва цікава, калі ў галоўнай ролі выступае не хто-небудзь, а прэзідэнт краіны. Хай сабе і замежнай.

Карацей, з Аляксандра Лукашэнкі НТВ зрабіла новага *«Глухаря»*. Той таксама стаў героем, нягледзячы на ўсе ягоныя выбрыкі, за якія ў Беларусі яго б імгненна выкінулі з міліцыі, ды яшчэ і пасадзілі за рабаўніцтва грамадзян. Тым не менш, для расіянаў *«Глухарь»* — герой. Менавіта таму, што ён паказаны з усімі заганамі, уласцівымі расійскім мянтам. Кажуць, быццам, «жывы чалавек». Такое самае пачуццё пачынае выклікаць (прынамсі, у расіян) і «Хросны бацька». Асабліва, калі яны параўнаюць паказанае па НТВ са сваёй карупцыяй і дзеяннямі ўласных чыноўнікаў.

Сапраўды, калі расійскія «слугі народа» ездзяць на «Майбахах», «Лексусах» ды «Ягуарах», але пры гэтым вельмі багатая краіна крычыць, што ў яе нестае тэхнікі для тушэння лясных пажараў, і просіць замежнай дапамогі… Тут «Хросны бацька» анёлам выглядае! Асабліва ў тыя часы, калі беларускія пажарныя тушаць расійскія лясы, а беларускія камбайнеры дапамагаюць збіраць збожжа ў Бранскай ды Смаленскай абласцях…

Як кажуць маркетолагі, адмоўная рэклама — гэта таксама рэклама. «Хай пра мяне кажуць як хочуць, абы казалі», — адзін з дэвізаў рэкламшчыкаў.

Дарэчы, пра Шэймана. З ім, як ужо вядома, здарыўся не вельмі прыемны казус. У Падмаскоўі яго затрымалі за перавышэнне хуткасці. Не спрацавала спецсувязь. Інфармацыя вельмі дзіўная. Каб у Беларусі не спрацавала спецсувязь па папярэджанні «не чапаць» высокага госця, гэта было б надзвычайнае здарэнне рэспубліканскага маштабу. Паляцелі б галовы. Але пытанне глыбей. Ці можна ўявіць, каб не дыпламата, не прэзідэнта, не амбасадара ў Беларусі суправаджаў бы міліцэйскі картэж? Каб нейкі расійскі дарадца прэзідэнта, кшталту Сяргея Прыходзькі, рассякаў бы па беларускіх дарогах у суправаджэнні картэжу? Занадта дробненькая фігура для картэжу і спецсувязі.

І што рабіў Шэйман у Маскве, калі яму быў забяспечаны такі картэж? Можа, здымаўся ў «Хросным бацьку–4», за што «Газпром», якому належыць НТВ, і «набыў» яму картэж і спецсувязь? А можа, расіяне папросту вырашылі паказаць памочніку беларускага прэзідэнта, хто ў доме гаспадар? Не надта моцна верыцца ў версію пра нечаканую забастоўку спецсувязі.

Пакуль ідзе вялая інфармацыйная вайна, камусьці ў Беларусі тэрмінова спатрэбіўся карвалол. Беларусь заключыла інвестыцыйны дагавор з прыватным вытворча-гандлёвым унітарным прадпрыемствам «МСП-ойл» аб будаўніцтве беларуска-расійскім ААТ «Ферэйн» фармацэўтычнага прадпрыемства ў Мінску. Мяркуецца, што на базе новай вытворчасці будуць выпускаць аналагі замежных лекаў у рамках праграмы імпартазамяшчэння.

Да кампаніі «Ферэйн», якая належыць расійскаму бізнесмену Уладзіміру Брынцалаву, перайшло фармацэўтычнае прадпрыемства «Дыялек» з наступным будаўніцтвам на яго тэрыторыі новага завода. Пры гэтым з «Дыялека» цалкам спішуць усе запазычанасці перад бюджэтам для наступнай перадачы СААТ «Ферэйн» як маёмаснага комплексу. Беларусь у выніку атрымае 25 працэнтаў акцый плюс адна акцыя СААТ «Ферэйн».

А ўвогуле, у нас усё нармальна, а будзе яшчэ «нармальней». У нас браня моцная, і будзе яшчэ мацнейшай. Днямі Аляксандр Лукашэнка паставіў шэраг задач па стварэнні сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі. «Адна з вострых праблем, характэрных для ўсіх рэгіёнаў краіны, — гэта аварыйнасць на дарогах, гібель і траўматызм людзей з-за парушэння правілаў дарожнага руху, — сказаў Лукашэнка. — У яе вырашэнні павінен быць комплексны падыход, нацэлены як на паляпшэнне тэхнічнага стану транспарту, дарог, так і на ўзмацненне кантролю за парушальнікамі правапарадку і хуткаснага рэжыму».

Паводле яго слоў, скарачэнню ўзроўню аварыйнасці павінна садзейнічаць фарміраванне адзінай сістэмы відэаназірання з фіксацыяй парушэнняў і наступным пакараннем парушальнікаў.

Ну зараз трымайцеся, усе дарадцы расійскіх прэзідэнтаў ды прэм'ераў! За Шэймана мы вам адпомсцім па поўнай!


Photo.ByMedia.Net

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЯКСАНДРА ГЕРАСІМЕНЯ



Беларуская спартсменка Аляксандра Герасіменя стала залатой прызёркай чэмпіянату Еўропы па плаванні на дыстанцыі 50 метраў на спіне. У фінальным заплыве, які адбываўся ў Будапешце, 24-гадовая Аляксандра Герасіменя паказала вынік 27,64 секунды, і тым самым перасягнула ўсталяваны ёй жа ў паўфінале рэкорд чэмпіянату Еўропы (27,98 секунды). Гэта першае золата топ-турніраў у кар'еры беларускі. Срэбным прызёрам стала Даніэла Самульскі з Германіі, бронза ў іспанкі Мерседэс Перыс Мінгуэ.

На гэтым чэмпіянаце Еўропы Аляксандра Герасіменя заваявала ўжо другі медаль. У яе актыве таксама срэбра на 100 метраў вольным стылем (першая ў кар'еры ўзнагарода на алімпійскай дыстанцыі).

Раней на кантынентальных форумах Аляксандра Герасіменя ўжо заваёўвала медалі. У 2002 годзе яна стала бронзавай прызёркай на 50 метрах вольным стылем і на 50 метрах на спіне. На чэмпіянаце Еўропы 2006 года заваявала срэбра на 50 метрах на спіне. У 2002 годзе на чэмпіянаце Еўропы на «кароткай вадзе» (даўжыня басейна 25 метраў) стала срэбным прызёрам на дыстанцыі 50 метраў вольным стылем. Ёсць у беларускі і ўзнагарода чэмпіянату свету. У 2007 годзе яна выйграла срэбра першынства планеты на дыстанцыі 50 метраў на спіне.

### ВІКТАР ШЭЙМАН



Памочнік кіраўніка Беларусі па адмысловых даручэннях Віктар Шэйман здабыў сабе славу аматара хуткай язды і парушальніка правілаў дарожнага руху. Былога генпракурора Беларусі затрымалі за перавышэнне хуткасці. Паведамляецца, што інцыдэнт адбыўся ў Маскоўскай вобласці ў нядзелю. Генерал-палкоўнік рухаўся на сваім джыпе Toyota Land Cruiser з Масквы ў Беларусь па Мінскай шашы.

Спачатку аўтамабіль Віктара Шэймана суправаджала міліцыя, пасля чыноўнік ехаў адзін, але пасты ДАІ атрымлівалі ўказанне забяспечыць «зялёную вуліцу» для іншамаркі з беларускімі нумарамі. Ды нешта адбылося з сувяззю, і пасты дарожных інспектараў не атрымалі гэту інфармацыю. На 131-м кіламетры Мінскай шашы супрацоўнікі дарожна-паставой службы спынілі іншамарку, якая імчалася з хуткасцю 140 кіламетраў на гадзіну, а побач з пастом-пікетам яшчэ і выехала на сустрэчную паласу.

Шэйман быў адным з бліжэйшых паплечнікаў Лукашэнкі з часоў прэзідэнцкай кампаніі 1994 года. Працаваў актывістам выбарчага штаба дзейснага кіраўніка Беларусі, яго памочнікам па пытаннях абароны і бяспекі, дзяржаўным сакратаром Рады Бяспекі Рэспублікі Беларусь, генеральным пракурорам. У студзені 2009 года атрымаў прызначэнне на пасаду памочніка прэзідэнта па адмысловых пытаннях, займаецца «венесуэльскімі» справамі.

Варта нагадаць, што Віктару Шэйману ад 2006 года забаронены ўезд у краіны ЕС і ЗША за парушэнне міжнародных стандартаў выбарчага права і правоў чалавека.

### ІГАР ВАРАШКЕВІЧ

На гэтым тыдні 50-гадовы юбілей адзначыў знакаміты рок-музыкант Ігар Варашкевіч. Харызматычны спадар Варашкевіч мае багаты досвед працы з рознымі музычнымі калектывамі і з'яўляецца сапраўды яскравай зоркай беларускай сцэны. Спачатку быў вакалістам, а потым лідэрам гурта «Бонда». Пасля распаду «Бонды» ў 1989 годзе Ігар Варашкевіч сышоў у гурт «Рокіс», які ў 1991-м пераўтварыўся ў гурт «Крама». Лідэрам «Крамы» ён з'яўляецца і дагэтуль.

Музычны крытык Зміцер Падбярэзскі ў інтэрв'ю «Еўрарадыё» з нагоды юбілею музыканта зазначыў, што Варашкевіч вылучаецца кантактнасцю і вераю ў сваю музыку. «Ігар з тых людзей, якія працягваюць традыцыі. Ён, захапіўшыся рок-музыкай, трымаецца класічнага мэйнстрыму — блюз-року, на якім, па сутнасці, уся рок-музыка і трымаецца. Гэта вызначальны варыянт. І тое, што Ігар зберагае веру ў гэту музыку і працягвае пісаць, выклікае да яго вялікую павагу. І пры гэтым ён вельмі таварыскі і кантактны чалавек, адораны не толькі ў музыцы. Я шчыра жадаю здароўя, трывання і веры ў сябе. Буду з нецярпеннем чакаць новы альбом з песнямі Ігара», — цытуе словы крытыка «Еўрарадыё».



АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ЦІ ЁСЦЬ ШАНЕЦ У ЛІБЕРАЛАЎ?

Сяргей НІКАЛЮК

**Пастаноўка мэтаў, што не падмацаваныя сродкамі для іх рэалізацыі, — галоўная загана ідэалагічнага мыслення.**



У сваіх «азбуках паліталогіі» я часта звяртаюся да тлумачальнага слоўніка замежных слоў. Гэтым разам ён мне спатрэбіўся, каб удакладніць сэнс слова «працэдура». Падзялюся з чытачамі сваёй чарговай лінгвістычнай знаходкай: «працэдура (лат. «procedere» — «прасоўвацца») — афіцыйна ўстаноўлены, прадугледжаны правіламі спосаб і парадак дзеянняў».

Працэдура, дакладней, пошук адпаведнай працэдуры, вось ужо шмат гадоў знаходзіцца ў цэнтры практычнай дзейнасці беларускай апазіцыі. У наяўнасці чарговае несупадзенне імпартнай тэорыі з айчыннай практыкай. «У іх» працэдура — спосаб і парадак дзеянняў. «У нас» — самі дзеянні. Але гэта не дзеянні па захаванні працэдуры. Божа ўратуй! Гэта дзеянні па яе пошуку.

Такое неардынарнае баўленне часу — быццам грып. Па-першае, носіць цыклічны характар, а па-другое, яно заразнае. Існуе маса разнавіднасцяў працэдурных дзеянняў. Найбольш папулярныя звязаныя з распрацоўкай працэдуры «выхаду на адзінага кандыдата».

У гэтым прэзідэнцкім цыкле пошук «адзінага» не атрымалася лакалізаваць у межах партыйных штабоў. Да яго далучылася грамадскасць. У прыватнасці, Рада беларускай інтэлігенцыі. Свой праект працэдуры рада апублікавала яшчэ ў красавіку. Падтрымкі з боку адрасатаў ён, зразумела, не атрымаў. У жніўні ініцыятары праекту канстатавалі небяспечнае запавольванне працэсу, а таму рашыліся на неардынарны крок. Яны правялі рэйтынгавае галасаванне — г. зн. не проста распрацавалі працэдуру, але здзейснілі на яе падставе дзеянне.

Прадказаць рэакцыю тых, хто не апынуўся ў пачатку рэйтынгліста, вялікай складанасці не ўяўляе. Я не збіраюся цытаваць. Адзначу толькі, што спроба ссунуць працэдурны воз з мёртвай кропкі прывяла да зваротнага выніку. Воз угрaз яшчэ больш.

## Палітык — прафесія?

Акрамя рэйтынгавага міжсабойчыку, праведзенага Радай беларускай інтэлігенцыі, чымсьці падобным займаюцца недзяржаўныя сацыялагічныя службы, толькі ў маштабах краіны. Прывяду чэрвеньскія электаральныя рэйтынгі НІСЭПД: Лукашэнка — 45,6%, Мілінкевіч — 5,4%, Казулін — 4,4%, Гайдукевіч — 1,2% і Сідорскі — 1,0%. Яшчэ 18 «палітыкаў» атрымалі на круг 3%.

Электаральныя рэйтынгі вызначаюцца пры адказе на пытанне «Калі б заўтра адбыліся выбары прэзідэнта Беларусі, за каго б Вы прагаласавалі?» Пытанне адкрытае, г. зн. спіс палітыкаў не прадугледжваецца. Калі ж яго прапанаваць, што і было зроблена ў чэрвені, то рэйтынгі, натуральна, падрастуць. Параўнаеце: Лукашэнка — 48,3%, Мілінкевіч — 9,9%, Казулін — 7,5%, Гайдукевіч — 3,5%.

Перавысіць узровень статыстычнай памылкі (3%) і ў гэтым выпадку больш ні ў каго не атрымалася. Пры гэтым намеснік старшыні АГП эканаміст Яраслаў Раманчук атрымаў толькі 1%. Здавалася б, такі электаральны мізер супярэчыць узроўню яго вядомасці. Артыкулы Раманчука з'яўляюцца ў прэсе з зайздроснай рэгулярнасцю. Яны досыць папулярныя, пра што сведчыць іх передрукоўка інтэрнэт-сайтамі. І тым не менш…

Нестыкоўка мае патрэбу ў каментарах. Па-першае, грамадская думка часам вельмі інертная. Слова «часам» у дадзеным кантэксце з'яўляецца ключавым. Калі людзям «здаецца» (яшчэ адно ключавое слова), што ім нешта пагражае, то грамадская думка можа сарвацца ў штопар і ад малаважнай падзеі. Аналагічны піруэт яна здольная прарабіць і ў процілеглым кірунку. Але для гэтага грамадская думка павінна папярэдне саспець. Таму месія заўсёды з'яўляецца ў момант яго пікавага чакання.

Адкрыты рэйтынг прэм'ера Сідорскага таксама склаў 1% (у спіс закрытага пытання ён уключаны не быў). З пазнавальнасцю ў прэм'ера праблем няма. Рэйтынг даверу ўраду не нашмат саступае рэйтынгу даверу прэзідэнта, але як палітык Сідорскі грамадствам не ўспрымаецца.

Палітык — прафесія адмысловая. Звярніце ўвагу: рэйтынгамі, якія перавышаюць статыстычную памылку, валодаюць выключна ўдзельнікі прэзідэнцкіх выбараў 2006 года. Сам факт трапляння ў выбарчы бюлетэнь на прэзідэнцкіх выбарах робіць чалавека палітыкам. Спіс такіх шчасліўчыкаў не можа быць шырокім. Калі б у сілу якіх-небудзь прычын спіс перасягнуў разумныя межы, то ўвага людзей усё роўна сфакусавалася б толькі на найбольш верагодных кандыдатах. Грамадская ўвага не гумавая. Гэта добра ведаюць прафесійныя менеджэры шоу-бізнесу.

## У кожнага свая рацыянальнасць

Што грамадская думка не гумавая, зразумела і на побытавым узроўні. А вось ці з'яўляецца яна рацыянальнай? Пытанне не выпадковае. Ад правільнага адказу залежыць выбар перадвыбарных стратэгій кандыдатаў. Звернемся, да прыкладу, да заяў ужо згаданага вышэй Раманчука. На сайце *www.ucpb.org* ён рэкламуецца ў якасці самага паслядоўнага ліберала Беларусі. Выбар на карысць ліберальнага ладу абгрунтоўваецца сацыялогіяй: «46% беларусаў хочуць больш эканамічных рэформаў і лібералізацыі».

Адзначу, што гэта ход нестандартны. «Лібералы нават у Вялікабрытаніі — партыя меншасці. Лібералізм па самой сваёй сутнасці — філасофія не масавая, а элітная», — заўважаў Марк Урноў. Для праверкі меркавання расійскага палітолага звернемся да вынікаў электаральнай падтрымкі лібералаў у Вялікабрытаніі. Узгадаем, што Партыя ліберальных дэмакратаў ёсць прадукт зліцця ў 1988 годзе Ліберальнай партыі з Сацыял-дэмакратычнай партыяй (!).

Адпаведна, захоўваць ліберальную цнатлівасць і пры гэтым займаць месцы ў парламенце сёння праблематычна нават на радзіме лібералізму. Такім чынам, у 1992 годзе «падпсаваныя» лібералы атрымлівають 20 месцаў у парламенце (з 650), у 1997 годзе — 46, у 2001 — 52, у 2005 — 62 і ў 2010 — 57. Для параўнання — кансерватары на апошніх выбарах атрымалі 305, а лейбарысты — 258 месцаў.

Самы паслядоўны айчынны ліберал, калі абгрунтоўвае свае прэзідэнцкія амбіцыі, прыводзіць наступныя аргументы: «Я эканаміст, што ва ўмовах крызісу для большасці выбарцаў з'яўляецца вырашальным фактарам. Па-другое, я новы твар беларускай палітыкі, а яго і хоча бачыць большасць грамадзян Беларусі ў бюлетэні для галасавання. Па-трэцяе, у маім партфелі цэласная праграма рэформаў, якія неабходна здзейсніць у Беларусі. Па-чацвёртае, вакол мяне сфармаваўся касцяк высокапрафесійнай каманды, здольнай рэалізаваць задуманае на практыцы».

Са здольнасцю Раманчука фармуляваць рацыянальныя аргументы не паспрачаешся. Вось толькі ці супадае яго рацыянальнасць з рацыянальнасцю большай часткі беларускіх выбарцаў? Памятаеце, як казаў Трус з мультфільма пра Віні-Пыха: «Што значыць «я»? «Я» бываюць розныя!» Заменім Труса класікам сучаснай сацыялогіі Максам Веберам, які вылучаў тры асноўныя тыпы жыццёвых стратэгій: прыстасаванне да свету, уцёкі ад свету і авалоданне светам. Кожнай стратэгіі адпавядае свой тып рацыянальнасці. Таму беларускія пенсіянеры, якія падтрымліваюць Лукашэнку, дзейнічаюць рацыянальна. Толькі прырода іх рацыянальнасці іншая, і з гэтым неабходна лічыцца. А вось спадзявацца, што падчас выбарчай кампаніі яны зменяць свой тып рацыянальнасці, не варта. Так не бывае.

## Разуменне як дзеянне

Прывяду яшчэ адно выказванне Раманчука: «Палітолагі, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці і палітыкі, якія прыкрываюцца праваабарончай дзейнасцю для атрымання знешніх рэсурсаў, жорстка крытыкуюць дэмакратычныя партыі і АДС па некалькіх асноўных прычынах: 1) ігнаруецца аўтарытарны кантэкст, 2) ігнаруецца рэсурсны кантэкст, 3) ідзе зачыстка палітычнага поля ад канкурэнтаў, 4) папросту хочацца размазаць каго-небудзь за што-небудзь».

Я не палітык, таму пункт 3 дачыненне да мяне не мае. Што да пункта 4, то ў рамках ліберальнай рацыянальнасці аспрэчыць яго немагчыма, і таму не буду марнаваць на яго час. А вось пунктам 1 і 2 я б зрабіў алаверды.

Толькі калі цалкам ігнараваць беларускія аўтарытарны і рэсурсны кантэксты, можна заяўляць пра рэальныя шанцы на электаральную перамогу практычна перад кожнымі прэзідэнцкімі і парламенцкімі выбарамі. Толькі калі не разумець прыроду легітымнасці беларускай улады, можна сцвярджаць, што «ва ўмовах крызісу ў Лукашэнкі няма адказаў на тыя пытанні, якія хвалююць большасць» (Лябедзька). Для большасці якраз адказы ў Лукашэнкі ёсць, чаго не скажаш пра адказы для меншасці.

Толькі пры ўмове поўнага адрыву ад беларускага кантэксту ў якасці працэдуры «выхаду на адзінага» можна было прапанаваць праймерыз, разлічваючы пры гэтым прыцягнуць «100, 200, а яшчэ лепш — 500 тысяч чалавек». На шчасце, напалеонаўскі план даволі хутка сціснуўся да ініцыятывы «правядзення праймерыз у тэставым рэжыме на тэрыторыі Аршанскага раёна». Адказных за такое сцісканне, як заўсёды, не знайшлося, як не знайшлося і адказных за натуральную смерць такой неардынарнай працэдуры.

Ці варта пасля гэтага дзівіцца, што ні адна з прапанаваных апазіцыйных стратэгій не мела пад сабой паліталагічнага абгрунтавання. Зразумела, што любое абгрунтаванне будзе спрэчным. Але яно павінна быць, і рабіць яго неабходна ў рамках сучасных паліталагічных тэорый і мадэляў. Хто сёння, да прыкладу, памятае пра стратэгію дыялогу, прынятую на кангрэсе ў 2007 годзе, мэтай якой быў «пачатак перагаворнага працэсу, свабодныя выбары і ўключэнне дэмакратычных сіл у працэс кіравання краінай, пачатак мадэрнізацыі грамадства і дзяржавы»?

Тэма супрацьстаяння аўтарытарнай улады і апазіцыі распрацоўваецца ў паліталогіі не адзін дзесятак гадоў. Даўно апісаныя ўмовы, пры якіх дыялог з аўтарытарнай уладай становіцца магчымым. Ці знайшлі час аўтары Стратэгіі–2007 скарыстацца парадай Леніна, каб «узбагаціць сваю памяць веданнем усіх тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва» па дадзенай праблеме? Пытанне рытарычнае.

Разуменне сацыяльнай рэальнасці, як падкрэслівае сацыёлаг Леў Гудкоў, — гэта таксама дзеянне, прычым больш істотнае, чым удзел у прамых грамадзянскіх акцыях. Перш чым выконваць свой грамадзянскі абавязак, кожны з нас павінен зразумець, у чым яго сутнасць. Гэта асабліва актуальна для палітыкаў, таму што ім па штаце належыць не толькі выконваць свой асабісты грамадзянскі абавязак, але і заклікаць да гэтага іншых.



РАЗВАЖАННІ

# НЕРАЗМЕННЫ РУБЕЛЬ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Калі 27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, гэта не было праявай нейкай асаблівай незалежніцкай пазіцыі.**



Мусіць, наменклатурная большасць дэпутатаў нават не зусім разумела, што робіцца ў белым свеце і што яны самі, уласна кажучы, робяць. Як гэта так, партыя ў СССР адна, армія адзіная, а саюзны ўрад мае столькі паўнамоцтваў і пераваг перад рэспубліканскімі, што яго належыць лічыць і самым магутным і адзіным. Карацей, які суверэнітэт, калі ўсе грошы ў Маскве.

Цікава, што ў адным з інтэрв'ю праз многа гадоў пасля змушанага зыходу ў адстаўку Вячаслаў Кебіч, са спасылкай на тыя ж абставіны, тлумачыў, што не зусім разумеў сэнс дакументаў, якія падпісваў ад імя беларускага ўрада. Што зробіш, не стаялі ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці постаці буйных палітычных дзеячаў. Хоць фармальна Кебіча можна лічыць адным з айцоў-заснавальнікаў сучаснай Беларускай дзяржавы.

Я свядома выключаю з гэтага шэрагу грамадскіх дзеячаў, якія незалежнасць рыхтавалі, але ў афіцыйнай палітыцы ўдзельнічаць не маглі. Тым не менш, імёны Вячаслава Кебіча і Станіслава Шушкевіча, лічу, занялі свае выключныя месцы ў гісторыі. Мяркую, што з цягам часу стане відавочным для ўсіх — месцы пачэсныя. А вось многія з сучасных дзеячаў, якія так няўклюдна «прыгандлёўваюць» беларускай дзяржаўнасцю, удзячных слоў ад нашчадкаў не пачуюць.




Лёс такі і час такі. Дэкларацыю трэба было прымаць, бо гэта ўжо зрабілі іншыя «братнія рэспублікі», і мінская наменклатура відавочна баялася ў канкурэнцыі з імі пагоршыць свае пазіцыі перад Саюзным урадам. А пераразмеркаванне рэсурсаў абяцала быць вялікім. Бо перш-наперш Эстонія, Латвія і Літва, а за імі Грузія ўжо рашуча адмовіліся трываць крамлёўскае апякунства. Прынамсі, калі ў снежні 1990 года ў Вільню завітаў Міхаіл Гарбачоў з жонкай ды папрасіў «*проявить терпение и не рубить с плеча*», то пачуў у адказ: «Дайце нам нарэшце магчымасць спакойна памерці ад голаду».

Жартавалі насамрэч, бо ведалі: горай не будзе.

А сярод беларусаў, ды нават украінцаў, такога разумення сітуацыі не было. Тым больш, што 17 сакавіка 1991 года адбыўся ініцыяваны Гарбачовым «усесаюзны» рэферэндум аб захаванні СССР. На яго хітра складзенае пытанне быў атрыманы станоўчы адказ большасці грамадзян. Але палітыка ў СССР ніколі не будавалася на выснове грамадскай думкі. Часцей было наадварот — улада ўсё рабіла насуперак пажаданням грамадства. І тое, што Крэмль звярнуўся да псеўдадэмакратычных метадаў захавання сітуацыі, яскрава сведчыла пра яго слабасць. Калі цэнтральная ўлада пытаецца ў мясцовых наконт жадання і надалей падпарадкоўвацца ёй, то гэта сведчыць, што насамрэч кіраваць імі яна ўжо больш не здатная. Сам факт правядзення рэферэндуму адразу зрабіў сумнеўным прынцып непарушнасці саюза.

Пасля правалу жнівеньскага путчу 1991 года амаль уся наменклатура на месцах зразумела, што Масквы больш можна не баяцца, гэтак жа, як нельга разлічваць і на яе дапамогу.

Нават не вельмі кемлівыя таварышы кіраўнікі з Мінска або Ташкента, назіраючы за тым, што вырабляе ў Маскве Ельцын, зразумелі — зваротнага шляху няма. Якія б хто сувязі не меў, колькі за іх не заплаціў — усё гэта ў адзін момант абрынулася. Як, кажуць, лёс гуляе чалавекам. Вядома, кожны па-рознаму ставіцца да яго паваротаў. Да таго ж і абставіны ў кожнага розныя.

Прыкладам, аграрным эканомікам Грузіі ды Малдовы дзяржманаполія знешняга гандлю надзейна гарантавала статус манапалістаў на агромністым усесаюзным рынку садавіннай ды гароднінай прадукцыі. Тона прададзеных у Маскве мандарынаў давала грузінскаму селяніну магчымасць прыдбаць «жыгулі». Калі ж СССР знік, межы адкрыліся і мыты зменшыліся, то імгненна развалілася і эканоміка Грузіі, не здольная канкурыраваць з краінамі з больш спрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі. Але ж грузіны не шукалі паратунку ў «аднаўленні былых народнагаспадарчых сувязей».

Можна па-рознаму ставіцца да незалежніцкага досведу краін Балтыі. Мусіць, менавіта іх унёсак у «развал СССР» самы вялікі. Але, з іншага боку, не трэба было ў свой час заганяць іх у «брацкую сям'ю» з дапамогай пакта Молатава—Рыбентропа. Ганебная дамова праз паўстагоддзя адпомсціла за тых, каго некалі выракла на смерць. Факт застаецца фактам — ужо больш дваццаці гадоў краіны Балтыі з крамлёўскай далоні нічога «за так» не атрымліваюць. Выстаялі і ўмацаваліся. Нават з улікам глыбокага крызісу ў Латвіі, абумоўленага паскоранай канцэнтрацыяй капіталу ў банкаўскай сферы гэтай краіны, усе пачуваюцца досыць упэўнена.

Як і большасць рэспублік, «кропку незвароту» БССР прайшла пасля краху ГКЧП, калі 25 жніўня 1991 года Дэкларацыі быў нададзены статус канстытуцыйнага закона. На яго аснове былі зроблены адпаведныя змены у Канстытуцыю, і БССР ператварылася ў Рэспубліку Беларусь. Нараджэнне новай незалежнай дзяржавы адбылося ў вельмі спрыяльных знешнепалітычных умовах, якія гарантавалі ёй абсалютнае і безумоўнае прызнанне міжнароднай супольнасцю, літаральна кожнай краінай.

Такім чынам, 27 ліпеня і 25 жніўня (не зважаючы на рэферэндумныя маніпуляцыі з пераносам Дня незалежнасці на 3 ліпеня) — гэта вельмі важныя для лёсу сучаснай Беларусі даты, якія патрабуюць да сябе большай дзяржаўнай і грамадскай увагі.

Беларусь па ўсіх параметрах (памер тэрыторыі, насельніцтва, кліматычныя ўмовы ды іншае) з'яўляецца сярэдняй еўрапейскай краінай. Мусіць, адзінай, якая ў сваёй палітыцы не выкарыстоўвае ўласнае геаграфічнае становішча.

Возьмем тую ж эканоміку. Пра што сведчаць дадзеныя плацежнага балансу? У гандлі з галоўным партнёрам, з Расіяй, у нас самае вялікае адмоўнае сальда. Яно меншае, чым год таму. Але застаецца самым значным з першых гадоў незалежнасці. І кожны раз сітуацыю даводзіцца выпраўляць коштам палітычных саступак. Ці браць у пазыку ў таго, хто дасць. А аддаваць з кожным годам усё больш складана. У адных пазычаем, іншым аддаём.

Буйнейшым асацыяваным партнёрам Беларусі стаў Мытны саюз. Але ў гандлі з ім у Беларусі таксама велізарнае адмоўнае сальда. Зразумела, што ўсё там вызначае Расія, паколькі прыбыткі на «казахстанскім напрамку» не могуць быць значнымі па вызначэнні.

Панаванне Расіі ў агульнай постсавецкай эканамічнай прасторы пазбаўляе Беларусь усялякіх надзей на паспяховае супрацоўніцтва з СНД. З ім у нас, зноў жа, велізарнае адмоўнае сальда.

Так яно і было з пешага дня. Але вось што важна. Маючы мінусы ў гандлі на постсавецкім рынку, Беларусь мела плюсы ў гандлі з астатнім светам. Зараз жа і тут дадатнае сальда змянілася адмоўным. Нягледзячы на тое, што сёлета аднавіўся экспарт калійных угнаенняў, цалкам замарожаны ў мінулым годзе.

А больш гандляваць няма чым. Акрамя незалежнасці. Бо яна для краіны насамрэч з'яўляецца тым неразменным рублём, які, колькі ты яго не выдавай, ён усё ж застаецца цэлым у кішэні. Такі гандаль ёсць звычайнай палітыкай, якую праводзяць усе ўрады свету. Калі з розумам — то з вялікім плёнам.

З НАГОДЫ

# ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ КПСС

Сяргей СЕМЯНОВІЧ

**Бялыніцкая раённая газета «Зара над Друццю» 31 ліпеня паведаміла пра тое, што днямі 21-гадоваму фельчару СВК «Калгас «Радзіма» Людміле Волкавай быў уручаны 100-тысячны білет члена рэспубліканскага ГА «Белая Русь».**



Здымак з газеты «Зара над Друццю». Справа налева: Надзея Серыкава, Барыс Зінкевіч, Любоў Волкава, Мікалай Пашкоўскі, Галіна Шлапакова

«Я задаволена сваім рашэннем папоўніць шэрагі гэтага грамадскага аб'яднання, — распавяла карэспандэнту «Зары над Друццю» Наталлі Бычковай фельчар. — На мой погляд, сябры «Белай Русі» ўносяць значны і дастойны ўклад ва ўмацаванне і росквіт Беларусі, актыўна працуюць на кансалідацыю патрыятычных сіл, садзейнічаюць захаванню эканамічнай і сацыяльнай стабільнасці нашай краіны. У гэты цікавы, імклівы час я хачу таксама быць у шэрагах тых, хто сваёй працай, актыўнай жыццёвай і грамадзянскай пазіцыяй прымнажае не толькі багацце Айчыны, але і ўмацоўвае яе суверэнітэт».

Каб уручыць Любові Волкавай членскі білет сябра ГА «Белая Русь» за № 100000, у аграгарадок Вішоў прыехалі намеснік старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі гэтага грамадскага аб'яднання Барыс Зінкевіч, сябра ГА «Белая Русь» Надзея Серыкава (адначасова намеснік старшыні Бялыніцкага райвыканкама), старшыня раённай арганізацыі ГА «Белая Русь» Мікалай Пашкоўскі (адначасова — начальнік Бялыніцкага раённага аддзела адукацыі). Павіншавала дзяўчыну і намеснік старшыні СВК «Калгас «Радзіма» па ідэалагічнай рабоце Галіна Шлапакова.

Што ж, можна толькі парадавацца, што столькі важных пасадавых асоб клапоціцца пра пашырэнне «Белай Русі». Пытанне толькі, чаму ж яны зусім не дбаюць пра пашырэнне шэрагаў іншых аб'яднанняў і ініцыятыў, такіх, напрыклад, як ГА БНФ «Адраджэнне», ГА «Рух «За свабоду», кампаніі «Гавары праўду!».

Большасць чытачоў ведае, як «добраахвотна» пашыраюцца шэрагі «Белай Русі». Шматлікія настаўнікі і супрацоўнікі ўстаноў культуры Бялыніцкага раёна расказалі мне столькі цікавага, як ім настойліва «рэкамендавалі» пісаць заявы на ўступленне ў ГА «Белая Русь», што хапіла б не адзін артыкул. Сумна толькі, што яны ад такіх прапаноў адмовіцца не могуць, а пасля скардзяцца незалежным журналістам на ўмовах ананімнасці.

Здзіўляе таксама «ўпёртасць» нашых высокіх чыноў ад ідэалогіі, якія ў масавым парадку, на «добраахвотнай» аснове, пашыраюць шэрагі такіх арганізацый, як ГА «Белая Русь» і БРСМ. Няўжо не памятаюць, як хутка «ляснуліся» КПСС і УЛКСМ, што ствараліся па падобнаму прынцыпу? І дзе ў момант падзеліся ўсе іх дзесяткі тысяч «членаў»...

Ну а пакуль у «Белай Русі», па словах яе старшыні, міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, «наперадзе галоўны экзамен — удзел у выбарах кіраўніка дзяржавы».

«Паспяховае выкананне гэтай задачы немагчыма без высокага ўзроўню арганізацыйнай працы, выканальніцкай дысцыпліны, бездакорнага выканання рашэння кіруючых органаў аб'яднання», — гаворыцца ў звароце Аляксандра Радзькова, які днямі апублікаваны ў «Народнай газеце».

ДЭМАГРАФІЯ

# КРАІНА, ЯКАЯ ЗНІКАЕ

Зміцер СОЛЬЦ

**У 2009-м у Беларусі знікла мястэчка — на 25 тысяч чалавек, з мужчынамі і старымі, з жанчынамі і дзецьмі. Летась знікла такое ж паселішча. А з 2001 па 2005 гады ў краіне штогод вымiралі адразу па два гарадкі — з немаўлятамі пераважна.**

Ніхто краіну не акупаваў. Ніхто яе не паліў. Не было ніякіх войнаў, эпідэмій, бежанства. Калі верыць афіцыйным друкаваным крыніцам, панавала стабільнасць і моцнае працвітанне. Але, па прагнозах ААН, да 2050 года насельніцтва Беларусі можа скараціцца на 40 працэнтаў. Да 6,3 мільёна чалавек — а гэта меней, чым за царскім часам. У лепшым выпадку — насельніцтва скаціцца да ўзроўню 1960-х гадоў.

З 1993 года Беларусь вымірае. Тое супала з абраннем першага прэзідэнта. Але ў гэтым рэжым амаль не вінаваты. Усё пачалося значна раней.

## Канец свету–2026

У 1960 годзе паважаны часопіс «Science» абвясціў пра канец свету. Была нават названая дата: пятніца, 13 лістапада 2026 года ад Нараджэння Хрыстова. У ролі прарока выступіў аўстрыйскі матэматык Хайнц фон Фёрстэр, які вывучаў рост насельніцтва. Паводле Фёрстэра, хуткасць росту паскараецца: да 2026 года на Зямлі чакаецца бясконцая колькасць людзей. І хаця выбух росту насельніцтва, які назіраўся ў 1960-я гады, крыху сцішыўся, скандальны матэматык адзначыў парадокс, які спецыялісты называюць «дэмаграфічным пераходам».

На першым этапе «дэмаграфічнага пераходу» і нараджальнасць, і смяротнасць высокія, насельніцтва амаль не прырастае; ягоная колькасць вагаецца ад эпідэмій, войнаў і голаду. Гэты этап — большая частка гісторыі чалавецтва, ажно да XVIII стагоддзя.

На другой стадыі, дзякуючы навуцы і медыцыне, смяротнасць зніжаецца, а нараджальнасць па звычцы застаецца высокай. Выбухае «дэмаграфічная бомба» (Еўропа XIX стагоддзя, сучасная Афрыка).

Нарэшце, на апошняй стадыі пераходу — і нараджальнасць, і смяротнасць аднолькава нізкія. Колькасць насельніцтва не расце, а застаецца стабільнай (мара прагназістаў).

Ды толькі нявыкрутка: у Беларусі (а таксама ў Расіі і Украіне) замест раўнавагі здарыўся абвал: цяпер тут смяротнасць перавышае нараджальнасць. Насельніцтва імкліва скарачаецца. Прычыны з большасці — у новаанабытых звычках.

## Шчасце аборту

У 1929 годзе Захад наведалі тры авантурныя чалавекі з добрай весткай пра Савецкі саюз. Першы з іх — рэжысёр-эксперыментатар Сяргей Эйзенштэйн. Другі — прыгажун і манюка Рыгор Аляксандраў. Трэці — франтавы аператар Эдуард Тысэ.

На буржуйскія франкі лявацкая тройца стварыла падрыўны «культур-фільм» пра шчасце абортаў — рэвалюцыйна легалізаваных у краіне Саветаў. Пад цяжарную загрымiравалі Рыгора Аляксандрава, які выў і стагнаў як сапраўдная парадзіха. (Пасля пытання акушэркі: «Гэта ў вас першыя роды?» — дакументальна-асветніцкая карціна ледзьве не сарвалася.)

Стужка з бясхітраснай назвай «Жаночая бяда, жаночае шчасце» выклікала доўгачаканы полавы скандал. У карціне дзяўчыну спакусіў і кінуў нягоднік. Цяпер яна стаіць перад цяжкім выбарам: пайсці ў чысценькую савецкую клініку ці да падпольнай абартысткі.

У заходняй абартысткі гнюсна, брудна, крывава (малюнкі і графікі дадаюцца). У савецкай клініцы (знятай у Еўропе) — прыгожа, радасна, пяшчотна. Удумлівыя лекары. Адказныя пацыенткі.

Гераічную кліентку, якая перамагла бяду, віншуюць цёмнымі ружамі. Кроплі вады на бутонах. Усмешка на 32 зубы. Трыумфальнае «жаночае шчасце». Вучыцеся таварышкі — і дамагайцеся сваіх правоў!

У 1955 годзе аборты пасля кароткай сталінскай забароны зноў будуць дазволеныя — і стануць асноўным савецкім сродкам «кантролю за нараджальнасцю». (На Захадзе аборты пацясніць гарманальная пігулка.)

Колькасць дзетак, што так і не пабачылі свет, ураждвае. Па разліках дэмографа Верасава на пачатку 1980-х у Савецкім Саюзе здзяйснялася да 7,5 мільёнаў абортаў штогод. Да 2,5 мільёнаў дзяцей прадухіляліся кантрацэпцыяй. Разам — 10 мільёнаў.

У Беларусі ў 1999 годзе прынамсі 59% усіх цяжарнасцяў завяршаліся абортамі.

Але і масавыя традыцыйныя аборты, і гарманальная анігіляцыя зародкаў яшчэ ва ўлонні — толькі праява глыбейшых зменаў. Справа не толькі ў навязаных звычках, але і ў матывах. У XX стагоддзі дзеці сталіся непажаданымі.

## Дзіцячая эканоміка

Як даводзіць лаўрэат Нобелеўскай прэміі па эканоміцы Гары Бекер, «кошт дзяцей» у аграрным грамадстве быў нізкім. А іхняя карысць расла адпаведна колькасці: у сялянскай гаспадарцы дзеці працавалі з маленства.

Сённяшнія дзеці каштуюць дорага: ім трэба даць сучасную адукацыю. Тут ужо «інвестыцыі» пераходзяць у якасць. Сем'і засяроджваюцца максімум на двух дзецях. За нейкіх усяго толькі 80 гадоў Беларусь прайшла шлях ад высокай нараджальнасці да маладзетнасці.

Дакументальны фільм Галіны Адамовіч «Завядзёнка» прысвечаны ўнікальнай шматдзетнай сям'і, што захавалася ў палескай глыбінцы. «Пладзіць галечу!» — абураліся гераіняй адукаваныя жанчыны, якім паказалі стужку. Але тут памылка зроку, уплыў стэрэатыпу: у фільме сям'я заможная.

Адукаваныя жанчыны самі не жадаюць мець многа дзяцей (калі ўвогуле іх жадаюць). У свой час дэмаграфічныя апытанні на гэты конт сталіся шокам. Але штораз пацвярджалася: у жанчын-чыноўніц дзяцей меней, чым у работніц. А ў работніц — меней, чым у сялянак.

Маладзетнасць раней закранала інтэлігенцыю. Але цяпер яна — усенародны здабытак. У сучаснай Беларусі колькасць дзетак, народжаных у сярэднім адной жанчынай, — 1,2 з тэндэнцыяй да зніжэння. Гэта амаль у два разы меней, чым патрэбна, каб аднавіць колькасць насельніцтва да ранейшага ўзроўню. Зрэшты, насельніцтва Беларусі не ўзнаўляецца з 1970-х гадоў, толькі цяпер гэта зрабілася відавочным.

## Інкубатары для Адольфаў Гітлераў

У антыўтопіі Олдаса Хакслі «Гэты новы цудоўны свет» дзяржава гадавала дзетак у прабірках — канвеерным метадам. І гэта была зусім не фашыстоўская дзяржава. Наадварот. Грамадства канчатковага спажывецкага шчасця, дзе нічога — ні прыязнасць, ні каханне, ні, самае галоўнае, цяжарнасць — не замінаюць асалодам. Хто сказаў, што антыўтопіі не ўвасабляюцца?

Канцлагерны доктар Менгеле эксперыментаваў з блізнятамі, каб клanаваць Гітлераў. У 1970-я гады савецкі дэмограф Піскуноў прапаноўваў з дапамогай штучных маніпуляцый павялічыць долю народжаных дзяўчынак.

Сурагатнае мацярынства — ужо рэальнасць, узаконеная ў Беларусі. Памнажэнне ў прабірках становіцца і прасцей, і больш даступным. З'яўляецца спакуса вырашыць праблему дэпапуляцыі «прабірачным канвеерам». Але «нараджальны» канвеер не дапаможа. У Беларусі сітуацыя ўскладняецца яшчэ і недаравальнай для еўрапейскай краіны смяротнасцю.

## Працвітаючыя могілкі

Толькі з 1992 па 2002 гады смяротнасць у Беларусі павялічылася на траціну. Зменшылася адно дзіцячая смяротнасць. Затое ўжо з 25 гадоў смерць бярэ рэванш. Асабліва люта расце гібель мужчынаў працоўнага веку.

Беларускія мужчыны паміраюць у два разы «ахвотней» за жанчын (хаця ўзроставая структура маскiруе гэтую адчувальную розніцу).

У «моцнай і квітнеючай» Беларусі людзі адмаўляюцца жыць. Яны ўцякаюць у алкаголь, наркотыкі, псіхічныя хваробы… Новых алкаголікаў у 1991 годзе было 86 чалавек на 100 тысяч. У 2007-м — ужо 328. (Па гэтым паказчыку мы пераплюнулі нават Расію. Там усяго 123.) Дыягназ «наркаманія» ў 1991 годзе паставілі 2 чалавекам з 100 тысяч, а ў 2007 годзе — ужо 12,4.

Псіхічных захворванняў, упершыню выяўленых, было 252 на 100 тысяч. А сталася — 669. Папросту эпідэмія нейкая. І ці толькі ў лепшай дыягностыцы справа?

Траўмы і атручванні — трэцяя прычына смерці пасля хваробаў сэрца і раку! З 1991 па 2007 смяротнасць ад гэтых прычынаў вырасла болей чым на траціну. Толькі ў 2002 годзе празмерная — у параўнанні з Еўропай — смяротнасць склала каля 80 тысяч чалавек (55% усіх смерцяў).

Да таго ж насельніцтва Беларусі, як і ва ўсёй Еўропе, імкліва старэе. У 1999 годзе пенсіянеры «дагналі» непрацоўную моладзь, а ў 2008 годзе пераўзышлі яе на паўмільёна. Але пры гэтым старасць пабольшыла беларускую смяротнасць толькі на 9%. Увесь астатні рост — а гэта болей за 20 працэнтаў — здабытак улады сённяшняй, што пакінула медыцыне падножны корм.

Шматлікія лядовыя палацы здароўе нацыі чамусьці не паляпшаюць. Аднак калі нават кінуць усе «палацныя» грошы на медыцыну — а гэта рабіць неабходна! — атрымаецца, у лепшым выпадку, прытармазіць, але не спыніць дэпапуляцыю, бо галоўную ролю ў ёй адыгрывае нізкая нараджальнасць.



| СМЯРОТНАСЦЬ МУЖЧЫНАЎ ПРАЦАЗДОЛЬНАГА ВЕКУ, НА 1000 ЧАЛАВЕК | | |
|---|---|---|
| Узрост | 1992 | 2002 |
| 15–19 | 1,4 | 1,1 |
| 20–24 | 2,6 | 2,4 |
| 25–29 | 3,2 | 4,0 ↑ |
| 30–34 | 3,8 | 5,1 ↑ |
| 35–39 | 5,3 | 7,0 ↑ |
| 40–44 | 7,8 | 9,9 ↑ |
| 45–49 | 11,3 | 14,5 ↑ |
| 50–54 | 16,3 | 21,4 ↑ |
| 55–59 | 22,2 | 30,4 ↑ |
| 60–64 | 31,7 | 44,5 ↑ |

© Паводле дэмаграфічных штогоднікаў ААН

## Здань еўрапейскай Беларусі

Беларусь вымірае таму, што гэта сучасная еўрапейская краіна. Еўропа раней сутыкнулася з пагрозай дэпапуляцыі. Так, першай ахвярай яшчэ ў 30-я гады сталася Францыя. Фашыстоўскі італьянскі міністр Чыяна тады здзекліва казаў, што Францыю ўвогуле можна не ўлічваць, бо штогод — праз выміранне — яна прайграе па бітве.

Французы спахапіліся ды пачалі заахвочваць нараджальнасць. Па вайне падтрымка сям'яў дала свае вынікі, але сексуальная рэвалюцыя ўсё спляжыла.

Галандзец Дзірк ван дэ Каа з бельгійцам Ронам Лестэгам кажуць наогул пра «другі дэмаграфічны пераход»: сям'я распадаецца надалей, смяротнасць перавышае нараджальнасць, а выміранне кампенсуецца толькі за кошт міграцыі. Зрэшты, у Беларусі міграцыя змяншае абязлюдванне ў лепшым выпадку на траціну.

Палітычныя і культурніцкія чыннікі масавай міграцыі яшчэ цяжэйшыя: прыклад — нядаўнія закалоты ў Францыі. Магчыма, мы назіраем апошні акт таго, што Шпенглер назваў «Захадам Еўропы». Спектакль — невясёлы. Скарачэнне і старэнне насельніцтва. Недахоп працоўнай сілы. Застой. Увоз мігрантаў з рэгіёнаў, дзе дэмаграфічны выбух яшчэ не завяршыўся. Праблемы асіміляцыі. Канфлікты. Заслона.

Ці можна зрабіць нешта? Адэпты «дэмаграфічнага пераходу» прапануюць расслабіцца. Іншыя кажуць, што перамены да лепшага залежаць ад людскіх высілкаў.

Можна скараціць недаравальна высокую смяротнасць мужчын, спыніўшы алкагалізацыю і падсілкаваўшы медыцыну, што палепшыць і сям'ю. Можна, пакуль узроставая структура (хаця і ненадоўга) спрыяльная, матэрыяльна заахвоціць нараджэнне дзяцей, адкладзенае сем'ямі да лепшых часоў.

Але самае важнае — трэба доўга і ўпарта змяняць адукацыю, эканоміку, культуру, каб вярнуць сям'і панішчаную дзяржавай аўтаномію і пашану. Варта дасягнуць нормы сям'і з 3–4 дзецьмі.

Справа такога «пераходу» — на дзесяцігоддзі. Калі адбудзецца — краіна перажыве надыходзячую ноч.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 23 ЖНІЎНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Хранікальна-дакументальны фільм «Беларускія грэнадзёры» цыклу «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі».
**09.05** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 1-я серыя.
**12.10** Меладрама «Свае дзеці» (Украіна).
**13.50** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Шлюб па завяшчанні».
**16.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.25** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»- 5» (Расія). 2-я серыя.
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Драматычны дэтэктыў «Клієнт» (ЗША).
**00.10** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**01.00** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.00** «Кантрольны закуп».
**10.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Танга з анёлам». Шматсер. фільм.
**12.05** «Жыць выдатна!».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Мае сябры. Тыгруля і Віні».
**15.30** «Жадаю ведаць» з М. Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. V сезон. 12-я серыя.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Прадукты "вечнай" свежасці».
**00.25** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10, 17.20** «Мінdriшчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Асабісты інтэрас».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** Канцэрт М.Задорнава.
**15.35** «Зорны рынг».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Італьянец». Расія, 2004г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Час забіваць». ЗША, 1996г.

### ЛАД

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Меладрама «Вяселле» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**12.15** Школа рамонту.
**13.15** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.15** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Тэлебарометар.
**14.55** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Відэафільм АТН «Кроў» цыклу «Грунвальд».
**19.35** Жаночая ліга.
**20.00** Меладрама «Пабочны эфект» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Сіці - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**00.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Моцарт». Фільм 1-ы. Дак. фільм.
**12.10** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** Фільм «Небяспечны век».
**16.00** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі.ru».
**00.40** «Таямніцы сакрэтных пратаколаў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** Крымінальная меладрама «Шлюбны кантракт».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Кактэйль Молатава». Відэафільм.
**12.10** «Следства вялі…».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.35** Вострасюжэтны баявік «Марскія д'яблы».
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Мотаспартыўны часопіс.
**09.45** Веласпорт. Тур Бенілюкса. Этап 5.
**10.45** Скачкі на лыжах з трампліну. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**12.15** Веславанне. Чэмпіянат свету на гладкай вадзе. Познань (Польшча). Дзень 4.
**13.45** Тэніс. Турнір WTA (Канада). Фінал.
**15.00** Веласпорт. Тур Бенілюкса. Этап 5.
**16.00** Веласпорт. Тур Бенілюкса. Этап 6.
**17.30** Тэніс. Турнір WTA (Канада). Фінал.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**21.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.15** Спідвэй. Кубак свету (Польшча).
**01.15** Спідвэй. Кубак свету. Ковентры (Вялікабрытанія).
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак кавы».
**07.55** Басаножпа свеце: «На шляху да гімбаў».
**08.20** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.35** Дакументальная гадзіна: «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, ЗША.
**09.55** Вагон.
**10.05** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 8 серыя.
**10.50** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**11.35** Фільматэка майстроў: «Нявеста пірата», драма, 1969 г., Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 8 серыя.
**18.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла».
**18.30** «Восень браслаўскіх вазёраў», дак. фільм, 2007 г.
**18.55** МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Андрэя Мельнікава.
**19.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.30** «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Шматкультурная Малдова».
**20.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Загуж, апошні прыпынак», дак. фільм, 2009 г.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.40** Фільматэка майстроў: «Нявеста пірата», драма, 1969 г., Францыя.
**23.10** Аб'ектыў.

## 24 ЖНІЎНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 2-я серыя.
**12.10** Драма «Свая праўда». 1-я серыя.
**14.05** Відэафільм «Млын моды-2010».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Планета гольфу: Іспанія».
**15.55** Серыял «Шлюб па завяшчанні» (Расія).
**16.50** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды» -5» (Расія). 3-я серыя.
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф кваліфікацыйнага раўнда. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф кваліфікацыйнага раўнда.

### ОНТ

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Кантрольны закуп».
**10.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Танга з анёлам». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**12.05** «Жыць выдатна!».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Мае сябры. Тыгруля і Віні».
**15.30** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ілюзія палявання». Шматсер. фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Хімік». Шматсер. фільм.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** Да 80-годдзю. «Георгій Данэлія. Пасля 10 гадоў маўчання».
**00.35** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінdriшчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Італьянец». Расія, 2004г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Next 3». Серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Мінdriшчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.20** Серыял.

### ЛАД

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Жаночая ліга.
**11.15** Дзіцячы фільм «Прыгоды Тома Сойера і Гекльберы Фіна» (СССР). 1-я серыя.
**12.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**13.30** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.25** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Відэафільм АТН «Ордэн» цыклу «Грунвальд».
**19.35** Жаночая ліга.
**20.00** Меладрама «Пабочны эфект» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.45** Баявік «Бязлітасны» (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Моцарт». Фільм 2-і. Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010
**16.00** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** «Жыццё нялёгкае... Сяргей Даўлатаў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** Крымінальная меладрама «Шлюбны кантракт».
**09.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Вочная стаўка».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** Серыял «Глушэц. Працяг».
**21.35** Баявік «Марскія д'яблы».
**23.25** Сёння.
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**10.30** Веласпорт. Тур Бенілюкса. Этап 6.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 108. Каманды. Хінтэрцартэн (Германія).
**13.15** Летні біятлон. Санднэс (Нарвегія).
**14.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.00** Веласпорт. Тур Бенілюкса. Этап 6.
**16.00** Веласпорт. Тур Бенілюкса.
**17.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**18.00** Спідвэй. Кубак свету (Польшча).
**19.00** Спідвэй. Кубак свету. Ковентры (Вялікабрытанія).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.55** Бокс. Міжнародны турнір. ЗША.
**22.00** Бокс.
**00.00** Мотаспартыўны часопіс.
**00.15** Спідвэй. Кубак свету. Военс (Данія).
**01.15** Спідвэй. Кубак свету. Военс (Данія).
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.45** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**08.25** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Шматкультурная Малдова».
**08.50** «Восень браслаўскіх вазёраў», дак. фільм, 2007 г.
**09.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Загуж, апошні прыпынак», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**09.35** МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Андрэя Мельнікава.
**09.50** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.15** «Мент», дэтэктыўны серыял.
**11.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма): «Ягайла».
**11.20** «Між двух берагоў», маст. фільм, 1995 г., Вялікабрытанія–Бельгія–Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.35** «Украдзены цуд», маст. фільм, ЗША.
**19.00** Госць «Белсату»: Вячаслаў Ракіцкі.
**19.20** «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
**19.30** Праект «Будучыня».
**19.55** Дак. гадзіна: «Дзённік «Народнага альбома», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Катынь. Генацыд і прапаганда», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**22.15** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

## 25 ЖНІЎНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 3-я серыя.
**12.10** Драма «Свая праўда» (Расія). 2-я серыя, заключная.
**14.05** Здароўе.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Еўрабачанне-2010». Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні.
**15.55** Серыял «Шлюб па завяшчанні».
**16.50** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 4-я серыя.
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Адмысловы рэпартаж АТН «Казахстан: ад світанку да змяркання».
**19.50** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф кваліфікацыйнага раўнда. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф кваліфікацыйнага раўнда.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 01.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Кантрольны закуп».
**10.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**12.00** «Жыць выдатна!».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Мае сябры. Тыгруля і Віні».
**15.30** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Ілюзія палявання». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Хімік». Шматсер. фільм.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** Асяроддзе пасялення. «Рэцэпт вызывання».
**00.35** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Next 3». Серыял.
**15.35, 21.30** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**22.55** «Дабро пажаліцца».

---

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Жаночая ліга.
**11.10** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.55** Дзіцячы фільм «Прыгоды Тома Сойера і Гекльбеы Фіна» (СССР). 2-я серыя.
**13.05** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.05** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**14.55** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Відэафільм АТН «Вайна» цыклу «Грунвальд».
**19.35** Жаночая ліга.
**20.00** «Смешныя людзі». Гумарыстычная праграма (Расія).
**21.05** Калыханка.
**21.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.50** Драма «Вясельная сукенка» (Італія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Лёс легіянера. Невядомы сын Горкага». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010
**16.00** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** Прэм'ера. «Чалавек з планеты Кін-дза-дза. Георгій Данэлія». Дак.фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** Крымінальная меладрама «Шлюбны кантракт».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Следства вялі…».
**12.10** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Глушэц. Працяг».
**21.40** Баявік «Марскія д'яблы».
**22.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Асэр» (Францыя)-»Зеніт» (Расія).

### EUROSPORT

**09.30** Горная гонка (Hill Climbing). Чэмпіянат Еўропы. Обэрзаксэн (Швейцарыя).
**10.00** Веласпорт. Тур Бенілюкса.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 108. Хінтэрцартэн (Германія).
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 120. Куршавель (Францыя).
**13.00** Спідвэй. Кубак свету(Польшча).
**14.00** Спідвэй. Кубак свету. Ковентры (Вялікабрытанія).
**15.00** Веласпорт. Тур Бенілюкса.
**16.15** Пляжны футбол. Міжнародны турнір. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**18.00** Спідвэй. Кубак свету. Военс (Данія).
**19.00** Спідвэй. Кубак свету. Военс (Данія).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.15** Абранае па серадах.
**20.25** Конны спорт. Кубак нацый. Агляд.
**21.25** Навіны коннага спорту.
**21.30** Гольф. Тур PGA. Чэмпіянат Wyndham. Грынсбара (ЗША).
**22.30** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Чэхіі. Чэхія.
**23.00** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат Шатландыі.
**23.10** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.15** Ветразевы спорт. Кубак Match (Швецыя).
**23.45** Ветразевы спорт. Med Cup (Іспанія).
**00.15** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.20** Абранае па серадах.
**00.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**01.45** Пляжны футбол. Міжнародны турнір. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.45** Госць «Белсату»: Вячаслаў Ракіцкі.
**08.05** Дакументальная гадзіна: «Дзённік «Народнага альбома», дак. фільм, Беларусь.
**09.05** «Катынь. Генацыд і прапаганда», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**09.55** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.20** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**10.45** «Украдзены цуд», маст. фільм, ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**17.55** «Катынь. Генацыд і прапаганда», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**18.45** Невядомая Беларусь: «Чарнобыль для Еўропы», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.15** Хто ёсць кім?: Уладзімір Арлоў.
**19.30** «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
**19.40** На колах.
**20.10** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Вітаўт».
**20.40** Побач з намі (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Адбыты тэрмін», маст. фільм, ЗША.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Алімпіяда».
**23.10** Аб'ектыў.

## 26 ЖНІЎНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** «Еўрабачанне-2010». Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні.
**09.05** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 4-я серыя.
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Мой» (Расія). 1-я серыя.
**13.50** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласнай персонай.
**15.55** Вострасюжэтны серыял «Шлюб па завяшчанні» (Расія). Заключная серыя.
**16.50** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.55** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 5-я серыя.
**18.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Меладрама «Чырвоны жэмчуг кахання» (Расія - Украіна).
**23.30** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Кантрольны закуп».
**10.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**12.00** «Жыць выдатна!».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Мае сябры. Тыгруля і Віні».
**15.30** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Ілюзія палявання». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Хімік». Шматсер. фільм.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** АНТ прадстаўляе: «Выбар +» з Сяргеем Дарафеевым.
**00.05** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Next 3». Серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.20** Серыял.

---

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Жаночая ліга.
**08.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.10** Жывы гук.
**11.50** Дзіцячы фільм «Прыгоды Тома Сойера і Гекльберы Фіна» (СССР). 3-я серыя.
**13.00** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.55** Пазакласная гадзіна.
**14.10** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**14.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**15.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.40** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**17.15** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.15** Відэафільм АТН «Поле» цыклу «Грунвальд».
**18.50** Футбол. Ліга Еўропы ЎЕФА. Плэй-офф. «Дынама» (Мінск) - «Брюге». Прамая трансляцыя.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Жаночая ліга.
**21.45** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.20** Час футбола.
**22.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**23.35** Драма «Вінаваты па падазроне» (ЗША - Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Прадаць Эрмітаж. Як сыходзілі шэдэўры». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010
**16.00** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** «Смяротная зброя. Лёс Макарава». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** Крымінальная меладрама «Шлюбны кантракт».
**09.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Крамлёўскія жонкі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.35** Баявік «Марскія д'яблы».
**23.25** Сёння.
**23.50** Прэм'ера. Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** «Алімпійская гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.00** Конны спорт. Кубак нацый. Агляд.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 117. Айнздзельн (Швейцарыя).
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**13.00** Спідвэй. Кубак свету. Военс (Данія).
**14.00** Спідвэй. Кубак свету. Военс (Данія).
**15.00** Вось дык так!!!
**15.15** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**16.30** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**17.45** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Порціман (Партугалія).
**19.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэвен (ЗША). 1/4 фіналу.
**21.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**01.25** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.45** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.00** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**08.50** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.10** Невядомая Беларусь: «Чарнобыль для Еўропы», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.40** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Вітаўт».
**09.50** Хто ёсць кім?: Уладзімір Арлоў.
**10.05** «Катынь. Генацыд і прапаганда», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**10.55** «Адбыты тэрмін», маст. фільм, ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**17.55** «На мяжы нормы», маст. фільм, ЗША.
**19.30** «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** «Цэнтральная Азія – з занядбанага краю на Радзіму», дак. фільм, 2007 г., Японія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 3 серыя.
**22.10** «Рэвалюцыя, якой не было», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**23.45** Аб'ектыў.

## 27 ЖНІЎНЯ, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 5-я серыя.
**12.10** Меладрама «Мой» (Расія). 2-я серыя, заключная.
**14.05** OFF STAGE LIFE.
**14.15** Хранікальна-дакументальны фільм «На Лініі Сталіна» цыклу «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Лёгка сказаць».
**15.55** Камедыйны серыял «Ажаніць Казанову» (Расія). 1-я серыя.
**17.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Меладраматычны серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). 6-я серыя.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Серыял «Сямейны дом» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Суперкубак УЕФА. Інтэр - Атлетыка. Прамая трансляцыя.
**00.00** Крымінальная драма «Футбольныя фанаты» (Вялікабрытанія).
**01.30** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Кантрольны закуп».
**10.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Чакай мяне». Беларусь.
**12.05** «Жыць выдатна!».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Мае сябры. Тыгруля і Віні».
**15.30** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Ілюзія палявання». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**22.10** «Дэтэктар хлусні».
**23.15** «Вораг дзяржавы-2. Легенда».
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Next 3». Серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.
**16.50** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Проста цудоўная». Германія - ЗША, 1999 г.
**22.55** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** Фільм «Крама «Імперыя». ЗША, 1995 г.
**01.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Час футбола.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Жансавет.
**10.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.10** Жаночая ліга.
**11.45** Драма «Вінаваты па падазроне» (ЗША - Францыя).
**13.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.30** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Усё аб бяспецы.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Відэафільм АТН «Перамога» цыклу «Грунвальд».
**19.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.20** Калыханка.
**20.40** Жаночая ліга.
**21.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.00** Меладраматычны трылер «Маяназаўжды» (Вялікабрытанія - Канада - ЗША).

### РОССИЯ телеканал

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**10.10** «Пяро і шпага Валянціна Пікуля». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Тэлесерыял «Катоўскі». Расія, 2010
**16.00** «Марк Бернэс: я распавяду Вам песню». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.30** Фільм «Рассмяшыць Бога».
**22.25** Навіны - Беларусь.
**22.35** Фільм «Маладая жонка».
**00.30** Фільм «Эквілібрыст».

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** Прэм'ера. «Мама ў вялікім горадзе».
**08.55** «Сяргей Міхалкоў». Фільм памяці паэта.
**10.00** Сёння.
**10.25** «Рускія сенсацыі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны баявік «Чорны горад».
**22.25** Камедыя «Знайсці Аманду».
**00.15** Драматычны трылер «Небяспечная прырода».

### EUROSPORT

**09.30** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**10.30** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Порціман (Партугалія).
**11.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**13.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Лепшыя моманты.
**14.00** Футбол. Ліга Еўропы. Лёсаванне.
**14.30** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Порціман (Партугалія).
**15.15** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**16.30** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**17.45** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**19.00** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэвен (ЗША). 1/2 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэвен (ЗША). 1/2 фіналу.
**20.45** Боўлінг. Шатобрыян (Францыя).
**21.45** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Расія.
**22.45** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.45** Горная гонка (Hill Climbing). Чэмпіянат Еўропы. Оберзаксэн (Швейцарыя).
**00.15** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**00.45** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Лепшыя моманты.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** « Рэвалюцыя, якой не было», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**09.30** «Цэнтральная Азія – з занядбанага краю на Радзіму», дак. фільм, 2007 г., Японія.
**10.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 20 серыя.
**11.05** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 3 серыя.
**11.50** «На мяжы нормы», маст. фільм, ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял: 53 серыя.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.15** Форум (ток-шоу): «Інваліды ў Беларусі».
**19.00** Басанож па свеце (спазнавальная праграма): «Вёска гімбаў».
**19.25** «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: ч. 1: выступ гурта «Фляўс і Кляйн».
**20.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Малдова, поўная віна».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Чалавек прэзідэнта–2», палітычны баявік, 2000 г., ЗША.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Залаты ікол».
**23.10** Аб'ектыў.

## 28 ЖНІЎНЯ, СУБОТА

### 1

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя). 1-я, 2-я серыі.
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Унебаўзяцця Найсвяцейшай Багародзіцы.
**09.15** Здароўе.
**09.45** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія).
**10.40** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**11.30** «Еўрабачанне-2010». Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні.
**12.10** Меладрама «Жорсткі раманс» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**14.45** Відэафільм АТН «Лоеў. Гісторыя, запісаная на вадзе» цыклу «Зямля беларуская».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона х». Вынікі тыдня.
**15.50** Лірычная камедыя «Белы паравоз» (Украіна).
**17.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Славянскі базар-2010». Творчы вечар Р.Паулса.
**21.00** Панарама.
**21.40** Рамантычная камедыя «Да чорта каханне!» (ЗША - Германія).
**23.30** Уласнай персонай.

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Пётр Тадароўскі. Жыццё забавамі поўнае».
**12.10** Фільм Пятра Тадароўскага «Ваенна-палявы раман».
**13.55** «Афіцэры. Адзін лёс на дваіх». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Афіцэры. Адзін лёс на дваіх». Працяг.
**17.55** Прэм'ера. «Знаёмства з бацькамі».
**18.55** Асяроддзе пасялення. «Рыбны дзень».
**19.55** «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Гарачыя навіны».
**23.05** Фільм «Усё жыццё перад вачамі».
**00.45** Камедыя Георгія Данэлія.

### СТВ

**07.30** «Вовачка». Камедыйны серыял. Заключная серыі.
**08.25** Фільм «Пяцёрка за лета». СССР, 1974 г.
**09.40** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.45** Фільм «Ляўшун». СССР, 1986г.
**15.20** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Аліса назаўжды». Расія, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Сутычка». ЗША, 1995г.
**23.10** «Зорны рынг».
**00.10** Фільм «Зямля тыгра». Германія - ЗША, 2000 г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.35** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.00** Нашы тэсты.
**09.10** Жаночая ліга.
**09.40** Жансавет.
**10.15** «Ты - тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія).
**10.55** Свая кампанія.
**11.45** «Запал па культуры» з Генадзем Давыдзько.
**12.30** Дэтэктыўная меладрама «Міф аб ідэальным мужчыне» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Блекберн Роверс - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**16.45** «Ян Макаравіч» («Беларусьфільм»).
**18.20** Дакументальны фільм «Зоркі.by» (Беларускае тэлебачанне).
**18.45** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**19.35** «Летні жарт з...». Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.35** Жаночая ліга.
**21.05** Эксцэнтрычная камедыя «Вясёлыя і загарэлыя» (Францыя).
**22.55** Камедыя «Марыць не шкодна» (Расія).
**00.20** Жывы гук.

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Фільм «Маладая жонка».
**08.40** Фільм «Рассмяшыць Бога».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Граф Монтэнэгра».
**14.00** Весткі.
**14.15** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля - 2010».
**16.40** «Падарожжы музыкі».
**17.05** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі.
**19.25** «Гарадок». Дайджэст.
**19.55** Фільм «Паўночнае ззянне».
**21.50** Камедыя «Страляй неадкладна!».
**23.40** «Святочнае шоў Валянціна Юдашкіна».

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Прыгодніцкі баявік «Нуль-сёмы зменяе курс».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.20** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.05** Крымінальная камедыя «Дом вялікай матулі».
**00.50** Прэм'ера. Драматычны трылер «3 чыстага ліста».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**11.00** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**12.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Лепшыя моманты.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**14.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
**16.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Брно (Чэхія). Дзень 1.
**17.45** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Адборачны этап. Порціман (Партугалія).
**19.00** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэвен (ЗША). 1/2 фіналу.
**20.00** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэвен (ЗША). Фінал.
**22.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 1.
**00.00** Конны спорт. Турнір Global Champions. Рыа-дэ-Жанэйра (Бразілія).
**01.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Брно (Чэхія). Дзень 1.
**02.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.45** Форум (ток-шоу): «Інваліды ў Беларусі».
**08.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Малдова, поўная віна».
**08.55** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Вёска гімбаў».
**09.20** МакраФон: ««Minsk-Mixt–2008»: ч. 1: выступ гурта «Фляўс і Кляйн».
**09.50** «Папялушка», тэлесерыял: 53 серыя.
**10.15** «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
**11.00** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**11.45** «Чалавек прэзідэнта–2», палітычны баявік, 2000 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Піўны смак».
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 22 серыя.
**18.20** «Лекар душы», рэпартаж, 2008 г.
**18.40** Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія. 1 серыя: «Самотны герой».
**19.30** «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Расціслаў Смаленскі».
**20.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**21.30** Суботні сеанс: «Папіён», біяграфічная драма, 1973 г., ЗША.
**00.50** Аб'ектыў.

## 29 жніўня, нядзеля

08.10 Мультфільмы.
09.00, 12.00, 15.00 Навіны.
09.05 «Арсенал». Праграма аб войску.
09.35 «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
09.50 Альманах вандраванняў.
10.15 Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
10.45 «OFF STAGE LIFE».
11.00 Відэафільм АТН «Млын моды-2010».
12.10 Камедыя «Міміно» (СССР).
14.00 Хранікальна-дакументальны фільм «Завяшчанне слуцкай княгіні» (Беларускае тэлебачанне).
14.30 Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Відэафільм АТН «Планета гольфу: ЗША».
15.55 Камедыя «Белыя Росы» («Беларусьфільм»).
17.35 Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
18.10 Суперлато.
19.00 Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
19.30 Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
20.30 «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
20.50 «КЕНО».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.05 Вострасюжэтны дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя» (Расія).

07.00 АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
08.00, 09.00 Нашы навіны.
09.05 Нядзельная пропаведзь.
09.20 «Мая выдатная няня». 2004 год.
09.55 «Шалапутныя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.10 «Шчасце ёсць!».
12.00 «Фазэнда».
13.10 Фаіна Ранеўская ў фільме «Мара».
15.00 «Акцёры адной ролі».
16.00 Нашы навіны.
16.15 Навіны спорту.
16.20 АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Наварасійск».
17.15 «Атручаныя рэўнасцю».
18.00 Прэм’ера. «Шлюбныя гульні».
19.00 Прэм’ера. «Містычная згуба зорак».
20.00 Контуры.
21.05 «Вялікая розніца».
22.10 «Жыццё-рака». Канцэрт Стаса Міхайлава ў Крамлі.
00.10-01.10 «Паўднёвае Бутава».

07.00 «Вовачка - 2». Камедыйны серыял.
07.55 Фільм «Проста цудоўная». Германія - ЗША, 1999г.
09.30 «Аўтапанарама».
10.00 «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
10.50 «Вялікі сняданак».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.15 «Добры дзень, доктар!».
13.50 «Дарагая перадача».
14.40 Фільм «Два капітаны». СССР, 1955г.
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Асабісты інтэрас».
17.20 Канцэрт М.Задорнава.
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
20.40 Фільм «Кіруючы палётамі». Германія - ЗША, 1999г.
22.55 «Прафесійны бокс».
23.55 Фільм «Ваенны рэквіем». Вялікабрытанія, 1989г.

08.00 Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
08.30 Нашы тэсты.
09.35 Жаночая ліга.
10.10 Школа рамонту.
11.15 «Ты - тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія).
12.00 «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
12.15 Гаспадар.
12.45 Дэтэктыўная меладрама «Міф аб ідэальным мужчыне» (Расія). 3-я і 4-я, заключная, серыі.
14.50 Сямейная меладрама «Маляня і Богіс» (ЗША - Харватыя).
17.05 Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
17.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Астан Віла - Эвертан. Прамая трансляцыя.
19.55 Смешная часіна.
20.30 Тэлебарометр.
20.50 Жаночая ліга.
21.20 Меладрама «Жыццё адно» (Расія).
23.10 Спартовая драма «Мірны ваяр» (ЗША - Германія).
01.15 Свая музыка. Працяг.

### РОССИЯ

07.00 «Здабытак рэспублікі».
07.30 Фільм «Паўночнае ззянне».
09.15 Камедыя «Страляй неадкладна!». 2008 г.
11.00 Весткі.
11.10 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Святочнае шоў Валянціна Юдашкіна».
14.00 Весткі.
14.15 Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля - 2010».
16.40 Прэм’ера. «Ізмайлаўскі парк».
19.00 Весткі.
19.25 Прэм’ера. «Ізмайлаўскі парк». Працяг.
20.15 Фільм «Ціхія хвоі». Расія, 2009 г.
22.05 Прэм’ера. Вострасюжэтны фільм «Хавайся!». 2010 г.
23.45 Фільм «Мама выйшла замуж».

### НТВ

07.40 Мультфільм.
08.00 Сёння.
08.20 «Дзікі свет».
08.45 «Іх норавы».
09.20 «Ямо дома!».
10.00 Сёння.
10.20 «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
10.55 «Крамлёўскія жонкі».
11.50 «Дачны адказ».
13.00 Сёння.
13.20 «Лепшы горад Землі».
14.10 Фільм «Бамжыха».
16.00 Сёння.
16.25 Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
17.25 «І зноў добры дзень!».
18.25 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.00 Сёння. Выніковая праграма.
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.50 Прэм’ера. «Цэнтральнае тэлебачанне».
21.55 Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
23.45 «Футбольная ноч».
00.15 «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

09.30 Ралі. Ралійная серыя IRC. Брно (Чэхія). Дзень 1.
10.00 Аўтаспорт. Аўтагонкі Гран-пры 3. Спа-Франкашам (Бельгія). Гонка 1.
10.30 Аўтаспорт. Аўтагонкі Гран-пры 3. Спа-Франкашам (Бельгія). Гонка 2.
11.00 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 1.
11.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
12.45 Аўтаспорт. Спа-Франкашам (Бельгія).
13.30 Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
15.15 Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэвен (ЗША). Фінал.
16.00 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 1.
17.00 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 2.
18.45 Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Порціман (Партугалія). Фінал.
20.15 Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
21.30 Бокс.
23.00 Мотаспартыўны часопіс.
23.15 Ралі. Ралійная серыя IRC. Брно (Чэхія). Дзень 2.
23.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
01.00 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. Этап 2.
02.15 Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

07.00 Аб’ектыў.
07.10 Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
07.35 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
07.50 Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
08.10 «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
08.30 Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Расціслаў Смаленскі».
08.40 Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія. 1 серыя: «Самотны герой».
09.25 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Піўны смак».
09.50 «Лекар душы», рэпартаж, 2008 г.
10.10 «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
10.40 «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 22 серыя.
11.25 «Папіён» (Papillon), біяграфічная драма, 1973 г., ЗША.
17.00 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Балтыйскі смак».
17.30 «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 9 серыя.
18.20 Дакументальная гадзіна: «Нармальнае жыццё», маст. фільм, 2003 г., ЗША.
19.30 «Пінгвінік Пік-Пок», мультсерыял.
19.40 «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 8 серыя.
20.25 Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
20.30 Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Гімбы: жыццё без вады».
21.00 Тыдзень у «Аб’ектыве».
21.30 Побач з намі (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
21.50 Фільматэка майстроў: «Разбіраючы Гары», маст. фільм, 1997 г., ЗША.
23.20 Тыдзень у «Аб’ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і пропісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у аддзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ПАРТЫІ

# КАРЫЧНЕВЫЯ ЯДНАЮЦЦА

Алег НОВІКАЎ

**Праварадыкальны фланг нямецкай палітычнай сцэны напярэдадні вялікіх узрушэнняў.**



Мабыць, з часоў падзення Берлінскай сцяны правы лагер ФРГ так не ліхаманіла. Тады, напачатку 1990-х гадоў, неанацысцкая сцэна літаральна ажыла дзякуючы наплыву неафітаў з былой ГДР. Прысутнасць ва ўсходнегерманскіх зямельных парламентах «карычневых» дэпутацкіх груп была нармальнай з'явай. Таксама, як і паведамленні ў прэсе пра напады на інтэрнаты эмігрантаў. Адначасова папулярным сярод моладзі стаў стыль скінхедаў, ішоў актыўны працэс станаўлення нацы-сегменту ў інтэрнэце.

Аднак сістэмны прарыў з-за шэрагу прычынаў у неанацыстаў не атрымаўся. Колькасць выбарцаў, якія галасуюць за ўльтраправых, паступова звялася да лічбаў на ўзроўні статыстычнай памылкі. Апошнім электаральным бастыёнам правых з'яўляецца сёння зямля Саксонія, дзе нацыянал-дэмакратам ужо два разы запар удаецца ўвайсці ў мясцовы ландтаг. Сабе ў плюс па выніках апошніх двух дзесяцігоддзяў правыя могуць запісаць толькі фармаванне адносна моцнай праварадыкальнай моладзевай субкультуры.

У іншым усё паступова вярнулася да фармату, у якім правыя былі напярэдадні падзей 1989 года.

Як і 20 гадоў таму, тон сярод арганізаваных праварадыкальных структур задаюць дзве групоўкі — Нацыянал-дэмакратычная партыя (NPD) і Нямецкі народны саюз (DVU). «Бронза» — у Рэспубліканскай партыі, якая адкалолася ад хрысціянскіх дэмакратаў у 1984 годзе. Плюс існуе цэлы шэраг дробных ініцыятыў, якія не маюць палітычнай вагі.

Так склалася, што адносіны паміж суб'ектамі правага лагера, мякка кажучы, не самыя добрыя, што лагічна адпавядае фюрэрскаму прынцыпу партый. Мелі месца спробы «жыць дружна». Апошні раз мірны пакт пад гучнай назвай «За Германію» быў падпісаны пару гадоў таму. Падпісанты — усё тыя ж NPD і DVU — абавязаліся не канкураваць адзін з адным на выбарах, выстаўляць агульнага кандыдата ці спіс. Недзе праз год дамова ў аднабаковым парадку была разарваная па жаданню NPD.

Тым больш нечаканай стала заява лідэраў DVU і NPD на чэрвеньскім з'ездзе нацыянал-дэмакратаў. Запрошаны на тусоўку лідэр саюзу Маціяс Фаўст і яго калега Уда Фойгт распавялі пра намер аб'яднаць падкантрольныя ім арганізацыі ў адно цэлае, заклаўшы тым самым падмурак, па іх словах, «самай моцнай правай партыі ў гісторыі ФРГ». У ліпені ў абедзвюх партыях прайшлі партыйныя рэферэндумы. У абодвух плебісцытах 90 працэнтаў удзельнікаў падтрымалі ідэю міжпартыйнага альянсу.

Такую незвычайную хуткасць шматлікія эксперты звязваюць з актывізацыяй іншага праварадыкальнага праекта. Гаворка пра нізавыя грамадзянскія ініцыятывы, якія спекулююць на тэме ісламскай пагрозы.

Праект абкаталі ў Кёльне былыя рэспубліканцы, якімі верхаводзілі выдавец Манфрэд Роус і адвакат Маркус Байзіхт. Яны зракліся тэматыкі Трэцяга рэйху і заняліся выключна адной праблемай — будаўніцтвам мінарэта ў адным з гарадскіх раёнаў.

У 2004 годзе «Pro Koeln» (так называлася антыісламская выбарчая ініцыятыва), атрымаўшы 4,7 працэнта, змагла прайсці ў магістрат. Кёльнскі прыклад заразіў нацыстаў у іншых землях. У красавіку 2010 года ў мясцовых выбарах у зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія прыняла ўдзел ініцыятыва «Pro NRW». Шмат галасоў праект «Pro NRW» у суме не адхапіў, але ў шэрагу буйных гарадоў змог правесці сваіх дэпутатаў у гарадскія рады.

Зараз актыўна мусіруецца тэма наконт магчымага фармавання ў нямецкай сталіцы ініцыятывы «Pro Berlin» пад прызначаныя тут на наступны год мясцовыя выбары.

Па сваёй сутнасці ідэя рознага кшталту «Pro Koeln» і «Pro NRW» вельмі простая — імпартаваць у Германію мадэль правых папулісцкіх партый Швейцарыі і Нідэрландаў, якія робяць стаўку на антыісламскую рыторыку. Аднак у арганізацыйным і ідэйным плане групоўкі выступаюць своеасаблівай альтэрнатывай класічнай мадэлі праварадыкальнага палітычнага руху, які сфармаваўся на нацысцкай ідэйнай традыцыі. Гэты фармат адстойвае Нацыянал-дэмакратычная партыя.

Цяпер паміж напрамкамі разгортваецца сапраўдная вайна за першасныя арганізацыі саюзу. Нягледзячы на тое, што рашэнне пра аб'яднанне DVU з NPD ужо ўвогуле прынятае, шматлікія «саюзнікі» не задаволеныя.

У іх вачах запланаванае міжпартыйнае аб'яднанне — не братэрства роўных, а хутчэй паглынанне. Так, па вялікаму рахунку, і ёсць. Для лідэраў DVU зліццё з нацыянал-дэмакратамі — адзіны шанец вырашыць праблему партыйнай пазыкі, якая выйшла за рамкі 900 мільёнаў еўра.

Другі фактар незадаволенасці — прысмак гістарычнага фіяска. DVU паўстаў у 1971 годзе як вынік выхаду з NPD унутранай апазіцыі. І вось зараз, праз 40 гадоў, даводзіцца прызнаваць, што тая фронда была памылкай, і з ганьбай вяртацца туды, адкуль прыйшлі.

Супернікі аб'яднання прынамсі настойваюць на прыняцці новай назвы для будучай адзінай партыі. У адваротным выпадку яны гатовыя перабегчы ў шэрагі Pro і блізкіх да іх рэспубліканцаў.

Лёс бітвы за саюз цікавы не толькі з пункту гледжання міжпартыйнай канкурэнцыі і ідэйнай арганізацыйнай перспектывы ўсяго нямецкага праварадыкальнага руху. Стаўка значна большая. Кансерватыўны ўрад Ангелы Меркель у крызісе. Напачатку жніўня, калі верыць апытанням, апазіцыйныя сацыял-дэмакраты ўпершыню за 10 гадоў зраўняліся з хрысціянскімі дэмакратамі па папулярнасці (31 працэнт).

Свой кавалак ад электаральнага пірага кансерватараў не супраць атрымаць і правыя. Як сцвярджаюць сацыёлагі, 26 працэнтаў электарату ХДС хацелі б на наступных выбарах галасаваць за партыі, якія ідэйна займаюць больш правыя пазіцыі, чым партыя Меркель. У агульных федэральных раскладах гэта значыць амаль 10 працэнтаў галасоў выбарцаў. Пра такую колькасць патэнцыйных прыхільнікаў ультраправыя не марылі з далёкага 1989 года.

Засталося вызначыцца: хто ж галоўны правы?




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Калі б Масква і Захад сумесна падтрымлівалі апазіцыйнага кандыдата на надыходзячых прэзідэнцкіх выбарах, яны б мелі вялікія шанцы на поспех. Асяроддзе прэзідэнта Мядзведзева лічыць, што эканамічныя інтарэсы расійскай эліты важней за ўсё. Вельмі верагодна, што пры супрацоўніцтве з Германіяй і Італіяй беларускі пірог, дагэтуль некранут прыватызацыяй, будзе падзелены паміж гэтымі гульцамі.

**«Wirtualna Polska» (Польшча)**

Відавочна, што на прэзідэнцкіх выбарах Масква паспрабуе зняць Лукашэнку. Але на што яна разлічвае, не маючы ў кішэні ніводнага прахаднога кандыдата, незразумела. Эксперты аднагалосныя: лідэр кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў, правадыр руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч і намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук, які стукаецца ў вароты Крэмля, выбары не выйграюць. …Зваліць яго (Лукашэнку) здольная, хіба што, здрада генералаў КДБ.

**«Росбалт» (Расія)**

Сітуацыя з Лукашэнкам цяпер нагадвае сітуацыю з Саакашвілі. У выпадку з Саакашвілі Расія пасля жнівеньскай вайны абвясціла яму байкот… Хтосьці лічыць, што байкатаваць кіраўнікоў дзяржаў — не самы лепшы сродак. Маўляў, Лукашэнка пакрыўдзіцца, сыдзе, лясне дзвярыма. Дзвярыма ляснуць можа, а вось ісці яму, па вялікім рахунку, няма куды. Як бы ні працавалі заходнія піяр-спецыялісты, мала хто з замежных лідэраў адважыцца працягнуць «апошняму дыктатару» руку. Тым больш, што праз некалькі месяцаў у Лукашэнкі выбары. І ён іх, вядома, як заўсёды, «выйграе». А Захад іх зноў не прызнае. Далей — справа за беларусамі. Ім выразна далі зразумець, што Лукашэнка Расіі больш не саюзнік.

**«Московский комсомолец» (Расія)**

Па дадзеных «Ъ», падчас сустрэчы кіраўнікі Малдавіі і Грузіі абмяркавалі яшчэ адну ідэю — магчымае запрашэнне ў ГУАМ беларускага лідэра Аляксандра Лукашэнку. Праўда, учора грузінскія афіцыйныя асобы адмовіліся абмяркоўваць з «Ъ» гэта пытанне, назваўшы яго «занадта далікатным». Аднак пасля нядаўняй сустрэчы ў Крыму спадароў Саакашвілі і Лукашэнкі ў адносінах Мінска і Тбілісі назіраецца відавочнае зближэнне. Больш таго, крыніцы «Ъ» у грузінскім кіраўніцтве паведамілі, што Міхаіл Саакашвілі ўжо накіраваў беларускаму калегу запрашэнне наведаць Грузію. Цяпер грузінскія ўлады чакаюць ад Мінску афіцыйнага адказу.

**«КоммерсантЪ» (Расія)**

У мінулую нядзелю на расійскім тэлеканале НТВ быў прадэманстраваны яшчэ адзін дакументальны фільм, галоўным героем якога стаў Аляксандр Лукашэнка. «Хросны бацька - 3» стаў чарговым цвіком, які расійская ўлада з задавальненнем убівае ў труну прэзідэнта Беларусі, даючы канчаткова зразумець пра свой намер спыніць любую падтрымку адыёзнага палітыка. Відавочна, што Крэмль рыхтуецца да наступных прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, перамогу на якіх Бацьку будзе атрымаць ужо не проста.

**«Індэпендэнт ньюс» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. ТРЭБА ПАКАЯЦЦА ЗА ГЕНАЦЫД ФІНА-УГРАЎ

Ліст з заклікам да ўкраінцаў пакаяцца за генацыд з'явіўся ў інтэрнэце. Яго аўтары звяртаюць увагу на такі этап у гісторыі Украіны, калі былі каланізаваныя землі фіна-ўграў, на тэрыторыі якіх зараз знаходзіцца цэнтральная Расія. «Каля тысячы гадоў таму Кіеўская Русь акупавала захад сучаснай Расіі, гэтыя землі засялялі фіна-угорскія плямёны. Тубыльцы жылі ў гармоніі з навакольным светам. Дзеці прыроды, яны не ведалі зла, не ведалі подласці», — такім чынам малююцца землі сучаснай Расіі да прыходу дняпроўскіх акупантаў. Пасля прыйшлі ўкраінцы. На думку аўтараў ліста, «тое, што ўчынілі старажытныя ўкраінцы на фіна-угорскіх землях у X–XII стагоддзях, нельга назваць інакш, чым генацыдам. Абарыгенаў нішчылі не толькі фізічна, але і духоўна. Украінцы паслядоўна знішчалі тубыльскія мову і культуру, сціралі з твару зямлі народную самасвядомасць. Ахвярамі сталі культура, мова». Аднак самая страшнае, калі верыць тэсту лісту, тое, што палітычная культура Русі перадалася тубыльцам, у выніку чаго і ўзнікла цяперашняя расійская аўтарытарная традыцыя. «Пуцін ці Мядзведзеў — гэта наша тварэнне?! Якімі ж нягоднікамі павінны былі быць старажытныя ўкраінцы, каб ініцыяваць з'яўленне на свет такіх «правадыроў нацыі» ?!». У фінале ўкраінцаў заклінаюць узяць на сябе адказнасць за генацыд фіна-ўграў і нават выплаціць грашовую кампенсацыю.

**Па матэрыялах Lifejournal**

### ГЕРМАНІЯ. ДЫРЭКТАР МЗС АДМОВІЎСЯ АД КАХАНКА

Як вядома, Гвіда Вестэрвеле, міністр замежных спраў ФРГ, належыць да катэгорыі сексуальных меншасцяў. Менавіта таму ў замежныя туры з ім ездзіць не жонка, а яго каханак Міхаэль Мронц. «Мы жадаем прынесці ў свет думку пра талерантнасць», — кажа пара. Такая практыка выклікала неадназначную рэакцыю ў краінах, дзе гомасексуалісты пераследуюцца на дзяржаўным узроўні. Гэта, здаецца, выклікала напружанасць у адносінах ФРГ з такога кшталту дзяржавамі. Інакш цяжка растлумачыць, чаму на днях нямецкі МЗС афіцыйна заявіў, што Міхаэль будзе заставацца дома, калі дырэктар ведамства накіруецца ў краіну, дзе гомасексуалізм лічыцца злачынствам. А сёння на свеце за нетрадыцыйны секс караюць смерцю ў Судане, Іране, Самалі, Нігерыі, Саудаўскай Аравіі, Маўрытаніі і Йемене. Заканадаўства яшчэ 70 краін разглядае гомасексуалізм як злачынства рознай ступені цяжкасці. Сам кіраўнік нямецкай дыпламатыі ад ідэяў талерантнасці не адмаўляецца, аднак прызнае, што «несці прагрэс» давядзецца паступова.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### ФРАНЦЫЯ. ЧАРГОВЫ ФЕСТЫВАЛЬ КЕЛЬТАЎ

Управінцыі Брэтань адкрыўся юбілейны 40-ы фестываль з удзелам прадстаўнікоў кельцкіх народаў (брэтонцы, жыхары вострава Мэн і Галіцыі, шатландцы). Праграма мерапрыемства вельмі разнастайная: канцэрты, лекцыі па гісторыі, выступы музыкаў, танцы і г.д. Хаця абсалютная большасць мерапрыемстваў мае выключна культурніцкі характар, усім зразумела, што фестываль закранае і палітычнае пытанне: як абараніць культуру кельцкіх народаў ад асіміляцыі. Так атрымалася, што акрамя ірландцаў іншыя народы не маюць сваёй дзяржаўнасці. Нават у Ірландыі, дзе амаль паўсюды пануе англійская мова, сітуацыю цяжка назваць аптымальнай. Калі меркаваць па прэсе, то большасць кельцкіх нацыяналістаў выступаюць супраць барацьбы за свае асобныя дзяржавы. На іх думку, трэба развіваць мясцовую культуру і перш за ўсё музыку, якая сапраўды вельмі папулярная ў свеце і можа стаць каталізатарам росту інтарэсу саміх кельтаў, якія раскінутыя па шматлікіх краінах, да сваіх каранёў. Добрым прыкладам з'яўляецца Брэтань, дзе палітычны рух за дзяржаўную самастойнасць дастаткова слабы. Аднак апошнім часам дзякуючы буму кельцкай музыкі назіраецца сапраўдны нацыянальны рэнесанс. У правінцыі з насельніцтвам 900 тысяч чалавек 180 тысяч размаўляюць па-брэтонску. Пра такія лічбы яшчэ пару дэкад ніхто нават не марыў.

**Па матэрыялах «Le Figaro» (Францыя)**

### КІТАЙ. ПЕСНІ СУПРАЦЬ МЕНТАЛЬНЫХ ХВАРОБ

У псіхіятрычным шпіталі аднаго з кітайскіх гарадоў пацыентаў ставяць на ногі дзякуючы песням часоў Мао і Сталіна. Кожны дзень пасля абеду хворыя праходзяць незвычайную аўдыёпрацэдуру — слухаюць маршы і песні, якія кітайцы спявалі ў эпоху Культурнай рэвалюцыі і Вялікага скачу. Калі верыць дактарам, музыкальная тэрапія сапраўды дапамагае, асабліва былым вайскоўцам. Зараз медыкі спрабуюць развіваць поспех, прымушаючы пацыентаў саміх спяваць.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### МАЛДОВА. ГІМПУ РЫХТУЕ ПРАВАКАЦЫЮ СУПРАЦЬ МАСКВЫ

Чым бліжэй 23 жніўня, тым больш спекуляцый вакол выконваючага абавязкі прэзідэнта Малдовы Міхая Гімпу на старонках малдаўскай прэсы. З'явіліся чуткі, што 23 жніўня (Дзень падпісання пакта Молатава — Рыбентропа) Гімпу прадставіць да адной з афіцыйных малдаўскіх узнагарод саюзніка Гітлера, румынскага маршала Антанеску. Камуністы, натуральна, супраць. Пры гэтым, аднак, імі выкарыстоўваецца цікавы аргумент. Як піша блізкая да іх «Новая газета», «пакт 1939 года — гэта гістарычны дакумент, абумоўлены логікай свайго часу, нічым не лепшы і не горшы за іншыя падобныя пакты і дамовы».

**Па матэрыялах «Новай газеты» (Малдова)**

ЦІКАВА

# ВЫРАТАВАЦЬ ПРЭЗІДЭНТА

**Алег ПЯТРОЎ**

**Вуснамі чачэнскага лідэра Рамзана Кадырава Масква абвясціла чарговую вайну рэшткам федэралізму ў Расіі. Кіраўнікам нацыянальных аўтаномій хочуць забараніць называцца прэзідэнтамі.**



Федэрацыяй Расія афіцыйна стала пасля таго, як у студзені 1918 года, разагнаўшы Устаноўчыя сходы, Саўнаркам прыняў Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатаванага народа. У Дэкларацыі быў такі пункт: «Расійская Савецкая Рэспубліка заснавана на свабодным саюзе свабодных нацый як федэрацыя Савецкіх нацыянальных рэспублік».

Аднак толькі ў 3-й Канстытуцыі РСФСР былі больш-менш прапісаныя нормы федэратыўнай арганізацыі. З'явіліся асобныя раздзелы пра аўтаномныя рэспублікі, іх органы дзяржаўнага кіравання, пра нацыянальныя акругі і г.д. Праўда, тая аўтаномія была хутчэй папяровай.

Падчас параду суверэнітэтаў 1990-х гадоў аўтаномныя рэспублікі сталі папросту рэспублікамі, а іх кіраўнікі — прэзідэнтамі. На нейкі час рэгіёны нават пачалі дыктаваць сваю волю Маскве.

Апошнія гады назіраецца зваротная тэндэнцыя. Так, вярнулася дарэвалюцыйная практыка прызначэння кіраўнікоў усіх суб'ектаў федэрацыі, уключаючы нацыянальныя рэспублікі. У дадатак з'явіліся так званыя федэральныя акругі, якія капіруюць існаваўшае ў царскай Расіі «намесніцтва».

І вось новы цвік у труну расійскага федэралізму. Зрабіў яго чачэнскі прэзідэнт Рамзан Кадыраў. 12 жніўня Кадыраў на публіцы адмовіўся ад звання прэзідэнта, паколькі, па яго словах, двух прэзідэнтаў у адной дзяржаве быць не можа. У якасці кампенсацыі ён патрабаваў даць яму званне «імам».

Дэмарш Кадырава і яго асабістыя забабоны наконт жадання стаць імамам трактуюцца ў расійскай прэсе па-рознаму. Шмат хто бачыць тут банальны сепаратызм. Нават сам факт асаблівай працэдуры атрымання легітымнасці (імам — духоўная асоба) падкрэслівае статус Кадырава і спецыфіку Чачні. Не кажучы пра тое, што змена назвы пасады з «прэзідэнта» на «імама» значыць не паніжэнне, а, наадварот, павышэнне аўтарытэта. Нарэшце, атрымаўшы статус імама, Кадыраў неафіцыйна пашырае сваю кампетэнцыю на ўвесь Паўночны Каўказ, які ў XIX стагоддзі ўваходзіў у склад імамату Шаміля.

Іншыя эксперты лічаць, што гэты крок Кадырава дэманструе моц, якую набыў палітычны іслам у рэгіёне. Каб надаць легітымнасць сваёй уладзе, кіраўніцтва Чачні вымушана выкарыстоўваць рэлігійны антураж, весці ісламскі дыскурс.

Затое выхадка Кадырава дала глебу аматарам пажартаваць. Здаецца, усе вядучыя выданні Расіі дзеля хохмы прапанавалі пашырыць ідэю Кадырава на іншыя суб'екты РФ. Напрыклад, называць кіраўніка Калмыкіі ханам. А Якуціі — тайон. Для кіраўнікоў цэнтральных абласцей Расіі пасуе, на іх думку, статус «князь». Што да Калінінградскай вобласці, то яе, з улікам гістарычнай спецыфікі, павінен узначаліць кайзер. Далей — больш. Нехта выступіў за тое, каб вярнуць ФСБ гістарычную назву — «*Пыточный приказ*».

Сур'ёзна казаць пра тое, што Кадыраў стане імамам, пакуль не даводзіцца. Прынамсі Рамзану патрэбна згода вярхоўнага мусульманскага духоўнага кіраўніцтва, якую ён так проста і хутка не атрымае. Тым больш, што сам Кадыраў быццам згодны на тое, каб называцца «кіраўнік рэспублікі». У верасні адпаведнае рашэнне пра новую назву кіраўніка адміністрацыі быццам будзе прынятае заканадаўчым органам Чачні.

На фоне жартаў пра імамаў і ханаў, між тым, адбываюцца больш канкрэтныя рэчы. Кадыраў паклаў старт новай фазе дэмантажу правоў малых народаў Расіі, якіх крок за крокам пазбаўляюць сімвалаў дзяржаўнасці.

Быццам па сігналу зверху шэраг лідэраў аўтаномій падтрымалі ініцыятыву Кадырава. Так, не мае жадання называцца прэзідэнтам кіраўнік Кабардзіна-Балкарыі Арсен Канокаў. На пытанне журналістаў, кім лічыць сябе спадар Канокаў, той сказаў, што ён «антыкрызісны менеджэр».

У Дзяржаўную думу ў хуткім часе будзе ўнесены законапраект, які прадугледжвае «забарону на выкарыстанне ў назвах органаў або ўрадавых асобаў суб'ектаў РФ слоў, які складаюць аснову назваў федэральных органаў дзяржаўнай улады».

Працэс уніфікацыі назваў кіраўнікоў рэгіёнаў, аднак, не будзе гладкім. Як мінімум супрацьстаяць законапраекту будуць выступаць Татарстан і Башкірыя, дзе гістарычна моцныя ідэі нацыянальнай дзяржаўнай аўтаноміі.

«Улады Татарстану не лічаць неабходным абмяркоўваць закон аб новай назве кіраўніка рэспублікі», — заявіў прэс-сакратар татарскага прэзідэнта Андрэй Кузьмін. А новы прэзідэнт Башкірыі Рустэм Хамітаў яшчэ ў дзень сваёй інагурацыі 19 ліпеня сказаў, што не будзе перагалядаць рэспубліканскі статус рэгіёна і адмаўляцца ад пасады прэзідэнта.

Чым бы не закончыўся набіраючы сілу канфлікт метраполіі і ўскраін, гэта толькі прэлюдыя да больш маштабнай канфрантацыі. Аналіз тэндэнцый сведчыць пра канцэптуальнае жаданне цэнтру цалкам ліквідаваць нацыянальныя адміністратыўныя адзінкі. Прынамсі сайт партыі «Патрыёты Расіі» не хавае стратэгічных задач стартаваўшай цяпер рэформы: «Патрэбна ініцыятыва, накіраваная на адмову ад прэзідэнцкіх тытулаў, ліквідацыю статуса рэспублікі ў складзе Федэрацыі, прывядзенне усіх суб'ектаў да аднаго прававога статусу».

ГЕАПАЛІТЫКА



# ЗА ПОЛЬШЧУ РЭГІЁНАЎ

Алег НОВІКАЎ

**За Бугам шырока святкуюць 90-ю гадавіну Варшаўскай бітвы. Між тым летам 1920 года адбылася яшчэ адна падзея, якая, магчыма, мае для краіны не меншае значэнне, чым Цуд над Віслай.**

«Не паляк, не немец, а сілезец!» Пад такім лозунгам 17 ліпеня ў цэнтры сталіцы Шлёнскага (Сілезскага) ваяводства Катавіцы маніфеставалі прыкладна тысяча чалавек.

Яны — у большасці сябры ініцыятывы Руху за аўтаномію Сілезіі (Ruchu Autonomii Śląska) — святкавалі 90-ю гадавіну ўстанаўлення аўтаноміі Сілезскага ваяводства і прыняцця акту, які надаваў Горнай Сілезіі правы аўтаноміі ў складзе польскай дзяржавы. Адпаведна тэксту акту, які прыняў Польскі сейм, Сілезія атрымлівала шырокія правы самакіравання: уласны парламент, казну, паліцыю і сістэму адукацыі.

На думку маніфестантаў, прыйшоў час аднавіць былыя прывілеі рэгіёну, які скасавалі ў 1945 годзе савецкія ўлады (праўда, у часы рэжыму санацыі польскія палітыкі таксама выступалі за ліквідацыю «дзяржавы ў дзяржаве»). Падчас акцыі яе арганізатары прапанавалі публіцы і прадстаўнікам СМІ праграму акцый і мерапрыемстваў, вынікам рэалізацыі якіх стане вяртанне Горнай Сілезіі статусу аўтаномнай правінцыі. Праграма называецца «Аўтаномія–2020».

На першы погляд, маніфестацыя ў Катавіцах чымсьці падобная да палітычнага карнавалу. Аднак не ўсё так проста. Лепшы доказ таму — прынятае ў маі гэтага года варшаўскімі чыноўнікамі заключэнне па пытанню так званай сілезскай мовы. Увесну Ruch Autonomii Śląska (RAŚ) папрасіў, каб мясцовай гаворцы надалі статус рэгіянальнай мовы. Пры гэтым актывісты Руху за аўтаномію Сілезіі спасылаліся на выніки апошняга перапісу ў рэгіёне. Адказваючы на пытанне анкеты, у графе «нацыянальнасць» 179 тысяч чалавек указалі, што належаць да сілезскай нацыі. Сярод іх яшчэ 56 тысяч адзначалі, што лічаць першай мовай сілезскую.

У дадатак ёсць прыклад кашубаў — заходнеславянскага этнасу, які жыве ў Памор'і. У 2005 годзе кашубская мова набыла статус рэгіянальнай, што, дарэчы, спрыяла развіццю мясцовага турызму. Кашубская культура і фальклор сталі адной з галоўных турыстычных фішак.

Аднак, нягледзячы на ўсе вышэй згаданыя аргументы, Варшава катэгарычна сказала сілезцам «не». Як гаворыцца ў заключэнні спецыяльнай камісіі, сілезскі дыялект не мае вялікіх адрозненняў ад іншых рэгіянальных гаворак, кшталту вялікапольскай і мазурскай. Таму прызнаць яго мовай немагчыма.

У такім рэзюме відавочныя палітычныя аспекты. Нельга нават параўноўваць кашубскае і сілезскае пытанні ў польскай гісторыі. Сілезія — вельмі багатыя на карысныя выкапні край — доўгі час была аб'ектам інтарэсу для ўсіх рэгіянальных палітычных цэнтраў: Саксоніі, Прусіі, Чэхаславакіі, Польшчы, фашысцкай Германіі… Каб падкрэсліць значнасць Сілезіі, лідэры RAŚ любяць згадваць словы прэм'ера Вялікабрытаніі Дэвіда Ллойд Джорджа. У 1920-я гады ён сказаў: «Далучыць Сілезію да Польшчы — тое ж самае, што даць малпе гадзіннік, які яна адразу сапсуе».

Каб вярнуць у сваё лона Сілезію, толькі ў 1920-я гады палякам спатрэбілася арганізаваць тры паўстанні. Тая ж аўтаномія Сілезіі была нічым іншым, як вялікім пернікам для сілезцаў напярэдадні рэферэндуму, які павінен быў вырашыць, у склад якой дзяржавы — Германіі або Польшчы — увойдзе край.

Стаяла лета 1920 года. Войскі Тухачэўскага імкліва набліжаліся да Варшавы, і перспектыва застацца ў краіне, якая будзе захопленая камуністамі, зразумела, не выклікала вялікага захаплення ў сілезцаў. Акрамя таго, напярэдадні прускім парламентам у Берліне быў таксама прыняты закон пра аўтаномію Сілезіі. Такім чынам, палякам трэба было прапанаваць электарату нешта больш цікавае. Таму з Варшавы літаральна засыпалі тубыльцаў бонусамі — далі ім самыя шырокія аўтаномныя правы.

Дарэчы, рэзалюцыя Сейму ад 15 ліпеня 1920 года пра аўтаномію Сілезіі спарадзіла яшчэ адзін цікавы гістарычны прэцэдэнт. Аказалася, што сілезцы атрымалі канстытуцыю раней, чым самі палякі (вярхоўны закон Другой Рэчы Паспалітай будзе прыняты толькі ў сакавіку 1921 года).

Здавалася, што пасля другой сусветнай вайны, калі ўся Усходняя Еўропа цалкам перайшла пад кантроль Масквы, сілезскае пытанне знікне само па сабе. Нічога падобнага. Ідэя адраджэння сілезскай дзяржаўнасці перажыла нават «халодную вайну». У 1989 годзе Ота фон Габсбург, дэпутат нямецкага Хрысціянскага сацыяльнага саюза ў Еўрапарламенце, выцягнуў з пыльных архіваў праект сілезскай Швейцарыі, пра які шмат казалі ў пачатку 1920-х гадоў. Яго аўтары выступалі за стварэнне ў Сілезіі другой Швейцарыі — саюзу нямецкіх, польскіх і чэшскіх кантонаў. Габсбург прапанаваў тую ж схему.

Ініцыятыву адразу падтрымалі нямецкія арганізацыі выгнаных — немцы, дэпартаваныя з Польшчы пасля другой сусветнай вайны. Канец усім спекуляцыям на гэты конт паклала заява МЗС ФРГ пра тое, што адзіная Германія не будзе дамагацца перагляду ўсходніх межаў.

Думаецца, менавіта магчымае вяртанне «выгнаных» прымушае польскіх чыноўнікаў асцярожна ставіцца да праекту аўтаномнай Сілезіі. Логіка простая — калі ёсць асобная сілезская мова, ёсць і асобны народ. А калі ёсць народ, дык чаму ён не мае аўтаноміі, якую ўжо калісьці меў? Калі вярнуць аўтаномію, давядзецца згадаць, што нямецкая мова таксама да вайны мела тут статус афіцыйнай. Калі ў край вернуцца немцы, узнікне пытанне кампенсацыі за канфіскацыі падчас дэпартацыі.

Таму пры ўсіх папулярных у сучаснай Польшчы сеансах настальгіі па часах Другой Рэчы Паспалітай на вяртанне Сілезіі аўтаномнага статусу польская эліта не пойдзе. Аўтанамістам застаецца змагацца. Яны гатовыя да барацьбы і робяць стаўку на лозунг «Польшча рэгіёнаў».

Ідэя ў тым, каб рэанімаваць папулярную ў 1990-я гады ў краіне Лігу рэгіёнаў, якая выступала за паслабленне функцый метраполіі на карысць правінцыі. Бліжэйшым часам суполкі новага руху плануецца заснаваць ва ўсіх ваяводствах. Наступным крокам будзе Марш рэгіёнаў на Варшаву (ён запланаваны на 2015 год) і, нарэшце, у 2019-м у Канстытуцыю, як прагназуюць лідэры RAŚ, будуць унесеныя папраўкі наконт правоў Сілезіі.

Вось такія прагнозы. Застаецца дачакацца вынікаў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ЭРЫКА ШТАЙНБАХ

Кансерватыўная партыя Хрысціянска-дэмакратычны саюз (CDU) і лідэр арганізацыі Федэральнага аб'яднання выгнаных (BdV), што абараняе правы асобаў, вымушаных пакінуць землі, якія пасля вайны перайшлі ад Германіі да Польшчы і СССР, і іх нашчадкаў, у гэтыя дні святкуюць круглую дату. 60 гадоў таму прадстаўнікі 30 арганізацый дэпартаваных з усходу немцаў прынялі ў Штутгарце так званую «Хартыю выгнаных», якая заклала падмурак для стварэння BdV. Для Эрыкі Штайнбах і яе сяброў па BdV дасюль вельмі важна, каб пункты «Хартыі выгнаных» у некаторай ступені (сама Эрыка кажа пра маральнае вымярэнне) дасюль вызначалі курс знешняй усходняй палітыкі ФРГ. Гэта, натуральна, не падабаецца суседзям ФРГ, якія бачаць у дзейнасці BdV замах на іх цэласнасць, а таксама левым нямецкім партыям. Апошнія пратэстуюць супраць святкавання гадавіны прыняцця «Хартыі выгнаных», паколькі яе прымалі тыя, хто ў большасці ў часы Гітлера былі нацыстамі. Акрамя таго, аўтары хартыі не бралі пад увагу злачынствы Германіі на акупаваных землях, а таксама Халакост. Яны звяртаюць увагу на тое, што Штайнбах не хоча адмовіцца ад прапісанага ў «Хартыі выгнаных» пункту «Права на радзіму», які фактычна ўтрымлівае заклікі да вяртання межаў Германіі 1937 года. Так ці інакш, заявы лідэраў BdV сапраўды часта знаходзяцца на мяжы палітычнай карэктнасці. Так, напярэдадні юбілею падпісання «Хартыі выгнаных» у адным з інтэрв'ю Эрыка заявіла, што вязні канцлагераў жылі ў лепшых умовах, чым выгнаныя.



### МІХАІЛ СААКАШВІЛІ

Калі верыць аўстрыйскай газеце «Standard», прэзідэнт Грузіі нажыў сабе ворагаў не толькі ў Крамлі, аднак і ў крымінальным асяроддзі. Газета сцвярджае, што аўстрыйская паліцыя знайшла ў арыштаваных грузінскіх аўтарытэтаў, якія жывуць у краіне, план адхілення цяперашняга грузінскага гаранта ад улады. Схема быццам уключае замах на прэзідэнта і міністра ўнутраных спраў, а таксама паралельную арганізацыю антыўрадавых маніфестацый. У змове быццам удзельнічае каля ста буйных злодзеяў. На гэтым этапе, адпаведна той жа «Standard», групоўка займалася зборам грошай на пераварот. Выданне таксама сцвярджае, што праз нейкага ўладальніка грузінскага кафэ ў Вене змоўнікі падтрымлівалі кантакты з сілавымі структурамі ў Расіі. Калі гэта сапраўды так, то тут няма нічога дзіўнага. Тактычна задачы Расіі і крыміналу ў Грузіі супадаюць. Міхаіл Саакашвілі, які вядомы сваёй антыкрамлёўскай пазіцыяй, таксама паслядоўны змагар і з грузінскім крыміналам.

### ХАСЭ ЛУІС САПАТЭРА

Прэм'ер-міністр іспанскага ўраду і лідэр сацыялістычнай рабочай партыі падвёў першыя вынікі праграмы, якую ён запусціў год таму. Яе сэнс у тым, каб прыняць на радзіму нашчадкаў палітычных эмігрантаў, якія напрыканцы 1930-х гадоў збеглі з Іспаніі ў пошуках выратавання ад правага тэрору Франка. Праграма сапраўды ўдалася: 222 500 нашчадкаў былых грамадзян Іспаніі падалі заявы на атрыманне іспанскага пашпарту. Чакаецца, што яшчэ як мінімум 500 тысяч чалавек хутка ўзгадаюць свае іспанскія карані. У 95 працэнтах выпадкаў Мадрыд задавальняе просьбу пра вяртанне на Пірэнеі. Праграму рэпатрыяцыі Сапатэра разглядае ў кантэксце аднаўлення гістарычнай справядлівасці. Між тым, апазіцыя з правай Народнай партыі крытыкуе ініцыятыву сацыялістаў. Магчыма, яна баіцца, што новыя іспанцы будуць у якасці падзякі галасаваць за партыю сацыялістаў, тым больш, што іхнія бабкі і дзяды ўцякалі з Іспаніі менавіта з-за сваіх левых поглядаў. Аднак тут не ўсё так проста. Галоўным чынам заявы аб вяртанні на гістарычную бацькаўшчыну пабеглі падаваць нашчадкі іспанцаў, якія аселі на Кубе. Імі, відавочна, кіруе імкненне як мага хутчэй вырвацца са свету сацыялізму.



▸ ЮБІЛЕЙ

# КРАЯВІД З ЧУЖЫМІ ХВОЯМІ

## ПУЦЯВІНАМІ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

Алесь ГІНЗБУРГ

**У 2010 годзе мы святкуем вялікі юбілей паэткі Ларысы Геніюш. Памяць адной з распачынальніц нацыянальнага адраджэння, сумлення і шматбольнага сэрца нацыі сёлета ўшаноўваецца прыхільнікамі незалежнай Беларусі па ўсім свеце. Напярэдадні ж дня нараджэння Геніюш своеасаблівае духоўнае пабрацімства з'яднала два гарадкі Еўропы — чэшскі Вімперк і беларускую Зэльву. З імі быў цесна сплецены лёс сям'і Геніюшаў, і кожны па-свойму стаў турмою для іх… 8 жніўня беларусы Чэхіі ўшанавалі памяць нацыянальнай паэткі адкрыццём дакументальнай выставы ў Ваўчынай вежы замка Вімперк.**


Замак Вімперк

### Жывы замак

«Вітаю ў нас на Шумаве!» — звяртаецца спадар з музычным іменем Антанін Дворжак да гасцей з Прагі і Мінска. Спадар Дворжак — кашталян замка Вімперк, пекнага помніка архітэктуры рэнесансу, заснаванага родам Рожмберкаў у XII стагоддзі. На чэшскі ўзровень захаванасці спадчыны замак можна назваць занядбаным, але ў добрым стане. Ён узяты пад абарону ЮНЭСКА, і сёлета поўным ходам ідзе яго рэстаўрацыя. Рабочыя ўзводзяць наноў часткова захаваныя сярэднявечныя муры і на зайздрасць беларускім аматарам старажытнасці вызваляюць унікальны інтэр'ер XV стагоддзя з-пад «новых» пераборак XVIII.

«Вімперк — гэта неацэннае ўражанне. Я падсумавала для сябе розніцу з нашым Мірскім замкам. Вімперк не такі штучна намакіяжаны, гэта замак жывы, рэальны, у якім жылі людзі, а цяпер працуюць археолагі, рэстаўратары. Тут няма шыку, затое ёсць гісторыя, легенды, пошукі слядоў і думак Геніюш», — кажа пражская беларуска Алена Ціхановіч, натхняльніца паездкі і арганізатарка мемарыяльнай выставы. Адкрыццё выставы арганічна ўплецена ў экскурсію-знаёмства з замкам. Каб знаёмства не расцягвалася, да беларускіх госцяў прыстаўлены хлопчык — сын замкавага кашталяна, які прыспешвае тых, хто марудзіць, спецыяльна вывучаным: «Наперад, калі ласка».

Групу заводзяць у падвал — і дзверы замыкаюцца. «Запомніце гэтую камору», — просіць кашталян, калі мы мінаем змрочнае халоднае сутарэнне сярэднявечнай кастэлі.

Але неўзабаве — свабода. Мы ўздымаемся на Ваўчыную вежу, у залю, дзе размешчана экспазіцыя дакументаў, прысвечаных чэшскаму перыяду Геніюш.



Выстава «Ларыса Геніюш: паэтка адвагі і надзеі»

### Паэтка адвагі і надзеі

Аўтаркай канцэпцыі выставы «Ларыса Геніюш: паэтка адвагі і надзеі» была спадарыня Францішка Сокалава — вялікая сяброўка Беларусі, даследчыца нашай літаратуры. Сама яна на ўрачыстасці прысутнічаць не змагла, але прагучаў яе пераклад верша Геніюш «Чужыя хвоі». А распачаў імпрэзу намеснік старосты горада Вімперк Богуміл Петрашэк: «Дагэтуль не так шмат людзей міжнароднага маштабу жыло ў нашым малым Вімперку. Цяпер мы ведаем, што тут была Ларыса Геніюш...»

Для чэхаў лёс беларускай паэткі — нядаўняе адкрыццё. Дазнаўшыся пра драматычную гісторыю сям'і Геніюш, кашталян Дворжак з энтузіязмам уключыўся ў доследы. Уважліва прачытаўшы мемуары паэткі, ён вызначыў, у якім памяшканні трымалі жанчыну пасля арышту ў сакавіку 1948 года. Гэта і была тая змрочная камора, у якой нас ледзь не замкнулі падчас экскурсіі.

На адкрыцці выставы выступалі як беларусы Чэхіі, так і «беларускія беларусы» — галоўны рэдактар часопіса «Дзеяслоў» Барыс Пятровіч і старшыня Беларускага ПЭН-цэнтра Андрэй Хадановіч. Пісьменнікі былі ў Чэхіі ў межах майстар-класаў, арганізаваных Беларускім ПЭН-цэнтрам для маладых літаратараў — пераможцаў конкурсу, прысвечанага стагоддзю Ларысы Геніюш. Таксама прачытаў вершы малады паэт Антон Рудак, чые творы стануць безумоўным бальзамам для тых, хто ўспрымае сучасную літаратуру выключна як «біццё вокнаў у бацькоўскай хаце». Хлопец не проста нарадзіўся ў адзін дзень з Ларысай Геніюш — 9 жніўня, — але і палічыў гэта знакавым супадзеннем, якое абумовіла яго жыццёвыя зацікаўленні. Яго паэзія — годны працяг традыцыі беларускай літаратуры.



Кашталян Антанін Дворжак і журналістка Алена Ціхановіч

### На зімовай гары

У 1939 годзе Заходнюю Беларусь далучылі да СССР, і былыя грамадзяне Польшчы Янка і Ларыса Геніюш, як і безліч іх землякоў у Чэхіі, зрабіліся людзьмі без грамадзянства. У 1945 годзе Саветы пачалі патрабаваць такіх асобаў назад «на радзіму». Ведаючы, чым скончыцца дэпартацыя ў СССР, Геніюшы да апошняга супраціўляліся. Ларыса Антонаўна папрасіла заступніцтва ў прэзідэнта Чэхаславакіі Эдварда Бенеша, і мінімальная абарона была дадзеная: сям'я атрымала чэхаславацкае грамадзянства, а доктара Янку Геніюша накіравалі на працу лекарам у памежны Вімперк.

У сваёй мемуарнай «Споведзі» Ларыса Антонаўна запознена злавала на мужа. Яна падазравала, што высылка ў Вімперк была намёкам з боку чэхаў для беларусаў — маўляў, у Шумаўскіх гарах так лёгка заблукаць і выблукаць ужо ў Заходняй Германіі, «у абдымкі амерыканцаў»... Але застацца ў сацыялістычным блоку было свядомым рашэннем Янкі Геніюша. Яго галоўны аргумент — галеча, якая іх чакае на Захадзе ў абмен на свабоду: яму не хочацца «есці кансервы ў Францыі» (як горка іранізуе Ларыса Геніюш, пазней у ГУЛАГу гэтыя «кансервы» былі недасягальнай марай). Янка пастанаўляе застацца ў Чэхаславакіі, дзе ўдалося абжыцца і стаць сваімі.

Перабыванне Геніюшаў Вімперку прыпала на зіму 1947–1948 года. Ларыса Антонаўна разрывалася паміж мужам, якому прыязджала дапамагаць па гаспадарцы і з хворымі, і 13-гадовым Юркам, які давучваўся ў гімназіі ў Празе. Калі Прага для яе — горад шчасця, то ў Вімперку ёй трывожна, яна бачыць гэтае ненавіднае ёй месца ў шэрых колерах. Менавіта такім каменна-няўтульным і сёння здаецца дом па адрасе «вуліца доктара Бенеша, 161», дзе кватаравалі Геніюшы.

Назва мястэчка Вімперк — чэшскае спрашчэнне ад нямецкага «Зімовая гара» — і Ларыса Геніюш напоўніцу адчула гэты зімовы холад. Пасля камуністычнага «лютаўскага» перавароту ў 1948 годзе новы ўрад Чэхаславакіі выдае Геніюшаў Саветам. З гэтага часу іх назаўжды разлучаюць з сынам.

Восем дзён пасля арышту Геніюшы правялі ў сутарэннях замка Вімперк, пасля былі этапаваныя ў горад Пісэк, а адтуль у Прагу, дзе іх перадалі ўладам СССР.

...У жніўні 2010 года нішто не нагадвае пра змрочныя паваенныя падзеі. На стэндах залітай сонцам залі — фотаздымкі, дзе выяўленыя шчаслівыя людзі: Янка, Юрка, Ларыса. Сенатар Томаш Ірса ў сваім выступе ад імя ўладаў Чэхіі прызнае, што тагачасны ўрад яго дзяржавы здзейсніў памылку, прыняўшы рашэнне аб дэпартацыі беларусаў у СССР. З вакна Ваўчынай вежы адкрываецца від на парослыя «чужымі хвоямі» горы.

«АМБАСОВІШЧА–2010»

# ГУЧНАЯ КОДА РАЎБІЧСКАЙ РОК-СІМФОНІІ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Паведамленне пра тое, што Амбасада ЗША ў Беларусі адмаўляецца ад сваёй рэзідэнцыі ў Раўбічах, выклікала хвалю расчаравання сярод аматараў айчыннай рок-музыкі. Справа ў тым, што лёс вядомага музычнага фэсту «Амбасовішча», які праводзіўся на яе тэрыторыі ўжо пяць разоў, у гэтым годзе апынуўся пад пагрозай.**



Фота аўтара

Гурт «У нескладовае»



«The Bishops» (ЗША)

Сумная навіна выклікала шмат меркаванняў і здагадак, якія былі спынены толькі тады, калі першыя запрашэнні на «Амбасовішча–2010» усё ж пачалі прыходзіць на адрас музыкантаў і сталых наведвальнікаў фэсту. Амерыканскія сябры беларускай рок-музыкі вырашылі даць шанец нашым выканаўцам яшчэ раз.

Мо таму, што сёлетняе «Амбасовішча» мела быць апошнім на гэтым месцы, шматлікія яго ўдзельнікі з замілаваннем разглядалі цудоўныя раўбіцкія краявіды — маляўнічую вёску Раўбічы і вадасховішча, якое паўстала на рацэ Ушача, смарагдавую зеляніну навакольных лясоў і бароў, утульнасць па-амерыканску коратка пастрыжаных лужкоў, на якіх ужо ў шосты раз разгортвалася музычная дзея фэсту.

Ад невясёлых думак пра будучыню фэсту ўсіх запрошаных на «Амбасовішча» адгарнула яго музычнае аздабленне: пад напаўзабытыя хіты «Slade і Sweet» настрой тых, хто ў гэты дзень прыехаў на фэст, патроху мяняўся да лепшага ў чаканні заяўленай музычнай праграмы «Амбасовішча–2010».

І вось надышоў час, калі цырымонію адкрыцця апошняга ў Раўбічах фэсту распачаў сваім уступным словам Часовы паверанны ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлан, які адзначыў, што за гады правядзення «Амбасовішча» фэст пераўтварыўся ў самае «жывое і гучнае» мерапрыемства амбасады ЗША ў Беларусі. Яго ўдзельнікамі на працягу ўсяго часу яго правядзення сталі нямала цудоўных беларускіх і амерыканскіх выканаўцаў, якія дзяліліся са слухачамі сваім пазітыўным настроем. Як і любая пазітыўная з'ява, адзначыў Часовы паверанны, «Амбасовішча» павінна мець працяг. Магчыма, у іншым месцы, магчыма, у іншым фармаце. У знак таго, што гэта не проста мары, спадар Скэнлан выпусціў у паветра галубоў.

Гэты сімвалічны жэст стаў сігналам для пачатку музычнай праграмы «Амбасовішча–2010». Гэтым разам, улічваючы няпэўную сітуацыю з месцам правядзення наступнага фэсту, яго арганізатары вырашылі падвесці своеасаблівыя рахункі і запрасілі пераможцаў мінулагодніх «Амбасовішчаў». Распачаць сёлетнюю канцэртную праграму было даручана мінулагоднім пераможцам фэсту — слаўгарадскаму гурту «Хуткі смоўж». Каманда — рэдкі госць на сталічных канцэртных пляцоўках, і таму было цікава параўнаць узровень музыкантаў «Хуткага смаўжа» цяперашні і мінулагодні.

Да гонару слаўгарадцаў (нездарма ж, са слаўнага горада!) адчувалася, што год для рэгіянальных выканаўцаў не прайшоў дарма: гурт набыў яшчэ больш прафесіяналізму, а іх праграма займела шмат якія рысы сапраўднага музычнага шоу. Песні, якія выканалі музыканты на пачатку праграмы фэсту («Малако», «Ехалі казакі», «Пра газ»), прывабілі слухачоў яркімі аранжыроўкамі, гумарам і выканаўчай дасканаласцю, асабліва ўдзельнікаў духавой групы.

Слаўгарадскіх «ветэранаў» змянілі ўдзельнікі больш маладога калектыву — гурта «Босае сонца», якія сталі вядомы беларускім слухачам дзякуючы перамозе на фэсце «Беларуская бардаўская восень–2007». Але ў адрозненне ад бардаўска-акустычнага гучання, што дамінавала ў ранейшых песнях гурта, на «Амбасовішчы» ўдзельнікі «Босага сонца» выканалі некалькі кампазіцый у больш жорсткіх рок-аранжыроўках.

Гэтыя змены выклікалі палеміку сярод тых, хто прызвычаіўся да твораў гурта ў акустыцы. Асабліва рознагалоссі тычыліся манеры спеваў вакаліста Алеся Зайцава, якому, здаецца, не зашкодзіла дадаць да сваёй лірычнай вакальнай палітры трошкі рок-драйву ці хаця б скрымінгу.

Пазітыўную хвалю «Амбасовішча» падхапіў наступны госць фэсту — гурт «Кальмары». Бярозаўскія музыканты парадавалі слухачоў вясёлым драйвам сваіх старых кампазіцый, кшталту «Бадмінтон» і «Яна і я», навінкамі — гумарыстычнай песняй «Імпарт-экспарт». Відавочна, «Кальмары» ўжо вырастаюць са свайго танцавальна-забаўляльнага амплуа. Для бярозаўскага гурта ўжо набліжаецца час, калі яны могуць стаць даволі заўважным гульцамі як на рэгіянальным узроўні, так і ў агульнай нацыянальнай рок-плыні.



Гурт «Zig Zag»

Не буду сцвярджаць за ўсіх наведвальнікаў фэсту «Амбасовішча», але даволі вялікае расчараванне ў мяне выклікаў сэт гурта «Dali», які гэтым разам не выканаў ніводнай песні па-нашаму. «Dali» двойчы перамагаў на фэсце, выступаючы менавіта па-беларуску.

І вось цяпер музыкі прадэманстравалі такую няўдзячнасць да роднага слова! Гурт «Naka» таксама не стаў асабліва абцяжарваць сваю свядомасць лішнімі «праблемамі» з роднай мовай, бо застаўся тутэйшым рэтранслятарам традыцый «*русского рока*». Гэта можна паважаць ці не, але гэта — пазіцыя музыкантаў «Naka». А вось у выпадку з «Dali» мы, здаецца, маем справу з чарговым «моўным кульбітам», якія часам практыкуюць некаторыя мясцовыя выканаўцы.

Добра, што лідару «Dali» Віктару Рудэнку выпаў шанец рэабілітаваць сваё стаўленне да беларускай мовы, калі ён выйшаў на сцэну фэсту ў складзе гурта «У нескладовае» пад кіраўніцтвам Рамана Арлова.

Трэба адзначыць, што гэтая каманда, беларускамоўная творчасць якой арыентавана, па словах лідэра, у асноўным на расійскага слухача, за невялікі час зрабіла даволі шмат: у рэпертуары «У нескладовага» з'явілася новыя кампазіцыі (якія і прагучалі на фэсце), музыканты сталі больш прафесійнымі і разняволенымі на сцэне, а песні гурта ўжо адрозніваюцца арыгінальнасцю і сучаснасцю ў аранжыроўках. Бадай, гурту пакуль не хапае яркіх поп-хітоў, які б прыцягнулі ўвагу слухачоў у Беларусі і ў Расіі. Але на гэта арыентавана праца асноўных кампазітараў гурта — гітарыстаў Рамана Арлова і Вадзіма Марголіна. Гэтым разам музыкантам «У нескладовага» дапамагаў і такі вядомы беларускі рок-музыка і хіт-мэйкер, як Аляксандр Памідораў.

Бадай, самай чаканай прэм'ерай сёлетняга «Амбасовішча» стала выступленне на сцэне фэсту гасцей са Злучаных Штатаў Амерыкі — гурта «The Bishops» з горада Омаха, штат Nebraska. «The Bishops» — прыхільнікі такіх пазітыўных стылістычных адгалінаванняў, як рэгі, ска і рокстэдзі. Карані гэтай музыкі трэба шукаць у мелодыях і рытмах Ямайкі, Карыбскіх астравоў, Паўночнай і Лацінскай Амерыкі, Афрыканскага кантыненту.

Відавочна, што для амерыканскіх музыкантаў з сельскагаспадарчага Небраска ўдзел у такім незвычайным і маляўнічым фэсце ў Беларусі стаў адной з галоўных прыгод у гэтым годзе! Цікава было назіраць, з якой адкрытасцю госці кантактавалі з музыкантамі і слухачамі, асабліва з блізкімі па духу і стылю выканаўцамі з «Хуткага смажа», з якой цікаўнасцю сачылі за беларускімі дзяўчатамі, аглядалі незнаёмыя краявіды, фільмавалі ўсе падрабязнасці «Амбасовішча–2010».

А калі вядучы фэсту Алесь Круглякоў запрасіў «The Bishops» на сцэну фэсту, то амерыканцы вельмі прафесійна, як кажуць, «на высокай ноце», выканалі шэраг рытмічных кампазіцый, якія выявілі іх разуменне стылю музыкі рэгі і ска. Цэнтральнымі фігурамі сэта амерыканскіх музыкантаў сталі гітарыст і вакаліст гурта John Green, выканаўца на трубе Ira Hughey і клавішнік Scott Norman, якія разам з іншымі ўдзельнікамі «The Bishops» перадалі беларускім слухачам свой цудоўны настрой, заахвоцілі іх да скокаў перад фестывальнай сцэнай, да гарачых апладысментаў.

Той факт, што «Амбасовішча» стала сапраўднай пляцоўкай для блізкага знаёмства беларускіх слухачоў і выканаўцаў з амерыканскай некамерцыйнай музыкаў (нагадаю, што госцем «Амбасовішча–2007» стаў world-music-гурт «FOX TRIO» са штата Канзас, у 2009 годзе беларусы пазнаёміліся з творчасцю арт-рок гурта «The Gifted Children» са штата Нью-Йорк) робіць фэст унікальным на ўсёй постсавецкай прасторы. Значыць, мы маем надзею чакаць працягу традыцый «Амбасовішча» як плацдарма беларуска-амерыканскага культурнага дыялога. Хоць і ў іншым фармаце.

ЗНАХОДКА

# ПАРТРЭТ МАСТАКА

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Пра выбітнага заходнебеларускага мастака Зміцера Крачкоўскага (1910–1991) вядома да крыўднага мала. Імя гэта грунтоўна забытае, ці, дакладней, пакуль не спазнанае. Толькі апошнім часам, дзякуючы спрыянню супрацоўнікаў Маладзечанскага ЗАГСА, стала вядома дакладная дата смерці майстра — 2 мая 1991 года. Не мелася на руках у даследчыкаў гісторыі беларускай культуры і хаця б больш-менш якасных фотаздымкаў мастака.**




Калі падчас падрыхтоўкі выставы «Арс-Інкогніта» вядомы калекцыянер, мастак і грамадскі дзеяч Уладзімір Крукоўскі цікавіўся, ці не знойдзецца ў маім архіве якой-небудзь фотавывы мастака, я сумеўся. Фотапартрэт мастака 1970–1980-х гадоў, які дастаўся мне з ласкі маладзечанскага краязнаўцы і грамадскага актывіста Міхася Казлоўскага, быў надта няякасны.

Выяўленая спадчына Зміцера Крачкоўскага абмежавана-сціплая і зберагаецца па большасці ў сховішчах Літвы і Польшчы. Але ёсць колькі арыгінальных графічных работ (9) мастака і ў фондах ДММ Беларусі, прыватных калекцыянераў і спадчыннікаў жыхароў Валожынскіх ваколіц. Небагата. Але не дзіва, бо па прызнанні мастака гісторыку і краязнаўцу Генадзю Каханоўскаму, «…увесь свой творчы даробак спаліў як варожы і ідэалагічна шкодны» яшчэ ў даваенныя часы, перад тым, як на шмат гадоў адправіцца на Поўнач, у савецкі працоўна-папраўчы лагер. Карацей, твораў вобмаль.

Але ёсць яшчэ спадзяванне, што з'явяцца дзякуючы яго сыну тыя некалькі алейных партрэтаў мастака, якія светлай памяці Генадзь Аляксандравіч Каханоўскі не паспеў перадаць на захаванне ў Скарынаўскі цэнтр. Дарэчы, як і сямейны фотаальбом Крачкоўскіх, які ўяўляе значную гісторыка-мастацкую цікаўнасць для даследчыкаў культуры Беларусі сярэдзіны XIX — першай паловы XX стагоддзя. Апрача таго, Зміцер Крачкоўскі, гадаванец мастацкага факультэта Віленскага ўніверсітэта ім. Стэфана Баторыя, быў знаёмы з Кузьмой Чурылам, Львом Дабржынскім, Міхасём Сеўруком і Язэпам Драздовічам, зацікаўлена наведваў творчую майстэрню Яна Булгака.

Сёння, напярэдадні 100-х угодкаў з дня нараджэння мастака (26 жніўня), з радасцю прапаную чытачам газеты раней нідзе не апублікаваную выяву Зміцера Крачкоўскага 1930-х гадоў, часоў ягонага сталення і творчага ўзлёту з асабістай справы мастака, што захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы.

Будзем спадзявацца, што з юбілею ўсё толькі пачынаецца.

ФЭСТ

# ПОДЫХ «НАВАЛЬНІЦЫ»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**27–28 жніўня ў рамках другога міжнароднага фестывалю феерверкаў «Навальніца» ў спартыўным комплексе «Лагойск» пад Мінскам гледачоў чакае незабыўнае піратэхнічнае шоу ад найлепшых каманд Еўропы і маштабныя канцэрты, хэдлайнерамі якіх стануць рок-гурты «Бі–2» і «Акварыум».**




У першы дзень фэсту цвіком музычнай праграмы стане выступ гурта «Бі–2», які прадставіць свой новы альбом «Пра што кажуць мужчыны». У дыск, які выйшаў гэтай вясной, увайшло 10 зусім новых песень, запісаных для аднайменнага фільма і натхнёных ім. Таксама прагучаць кампазіцыі з альбома «Лунапарк» (2009) і ўсе галоўныя хіты гурта, у тым ліку «Палкоўніку ніхто не піша» і «Мой рок-н-ролл».

У другі дзень хэдлайнерамі вечару будуць Барыс Грэбеншчыкоў і гурт «Акварыум» з адмысловай акустычнай праграмай пры ўдзеле брытанскага музыкі Алока Верма. Барыс Барысавіч і яго калегі прывязуць з сабой агонь летняга сонца і выплюхнуць яго на аматараў феерверкаў.

Таксама наведнікаў чакаюць выступы беларускіх калектываў. 27 жніўня на фэставую сцэну выйдзе поп-гурт «Atlantica», а 28 жніўня гледачоў сустрэне гурт «Крамбамбуля», які прадставіць на фэсце хіты і новы максі-сінгл «Раз-два-тры — усе за стол!», а таксама малады гурт «Open Space».

Апроч музычнай праграмы гледачы ўбачаць выступы шасці піратэхнічных каманд (па тры ў кожны з дзён), якія збудуюць у небе «агністыя карціны» пад загадзя абраны акампанемент. У фэсце бяруць удзел лепшыя майстры піратэхнікі з Італіі, Эстоніі, Украіны, Польшчы і Расіі. Завершыць мерапрыемства пазаконкурсны гала-феерверк ад беларускай каманды «Кальвін» — чэмпіёна Еўропы–2007.

Кошт квітка на кожны з фэставых дзён складае 80 тысяч рублёў. Дзеці да 12 гадоў у суправаджэнні бацькоў — бясплатна. Гледачы могуць прыехаць на фэст як на асабістым аўтатранспарце (да вашых паслуг бясплатная пашыраная паркоўка на 3 тысячы машынамесцаў) і на адмысловых аўтобусах (пры наяўнасці квітка на фэст праезд бясплатны).

Набыць квіткі можна ў касах Палаца Рэспублікі, к\з «Мінск», у пераходзе на плошчы Я. Коласа, у электронных сістэмах *Bilet.tut.by*, TicketPro і на сайце *www.soundline.by*. Даведка і замова: (025) 952 45 55. Больш падрабязная інфармацыя пра фэст і яго праграму на сайце *www.navalnica.by*.

**Барыс Грэбеншчыкоў прывязе агонь летняга сонца і выплюхне яго на аматараў феерверкаў. У фэсце возьмуць удзел лепшыя майстры піратэхнікі з Італіі, Эстоніі, Украіны, Польшчы і Расіі**

РЭЦЭНЗІЯ

# УЦЁКІ З РЫМСКАЙ ІМПЕРЫІ

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Фільм «Цэнтурыён» (Вялікабрытанія, 2010, 97 хвілін) — гістарычны баявік з жорсткімі сцэнамі ад рэжысёра Ніла Маршала — я б ацаніў амаль на дзве зорачкі. Так сабе.**




117-ы год нашай эры. Цэнтурыён Квінтус Дыяс — адзіны ацалелы пасля налёту піктаў на памежны рымскі фарпост. Разам з непераможным Дзевятым легіёнам герой адпраўляецца ў брытанскія лясы, каб знішчыць кіраўніка бунтаўнікоў Гарлакона. Але хітрыя пікты рыхтуюць рымскім акупантам пастку…

Брытанскі рэжысёр Ніл Маршал праславіўся нізкабюджэтнымі і дынамічнымі фільмамі жахаў, дзе героі ў экстрэмальных умовах выпрабоўваліся на чалавечнасць. У «Сабаках-ваярах» група жаўнераў трымала абарону ад ваўкалакаў. У «Спуску» жанчыны-альпіністкі траплялі ў пячору з кіпцюрастымі канібаламі. Як добра зробленыя жанравыя стужкі, фільмы трапілі ў даведнікі, а сам рэжысёр атрымаў статус узыходзячай зоркі страшнага кіно.

«Цэнтурыён» — працяг улюбёнай рэжысёрскай тэмы: цывілізацыя супраць дзікунства; страх супраць салідарнасці. Карціна па звычцы перанасычаная жорсткімі сцэнамі. А ваярка піктаў Этэн у выкананні Вольгі Курыленкі выглядае сапраўднай дэманіцай — прагнай да крыві і бязлітаснай у помсце.

Хаця рэжысёр намякае на заняпад Заходняй цывілізацыі, узгадвае імператараў і колішніх ваяроў, «Цэнтурыён» мог разгортвацца ў любых дэкарацыях. Гістарычныя (і даволі сціплыя шаты) для чарговай гульні на выжыванне — залішнія. Яны толькі падкрэсліваюць непрывабнасць крывавых сцэнаў. Аматарам удумлівай гісторыі на стужку лепей не хадзіць. Але заўзятарам тэстастэронавых гульняў фільм прыйдзецца даспадобы.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 794

Падпісана да друку 20.08.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.